ШТО СТАЛА З БЕЛЫМІ РОСАМІ?

НІЧЫЙНЫХ ДАМОЎ НЕ БУДЗЕ?

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

21 ВЕРАСНЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 182 (28798)

9-24 стар.
МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Юрый СЯНЬКО, старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта:

«Асноўная задача прадстаўнікоў мытных органаў краіны ў плане падрыхтоўкі да II Еўрапейскіх гульняў — забяспечыць бяспеку пры перасячэнні мяжы спартоўцамі, балельшчыкамі, гасцямі і, безумоўна, своечасова аформіць тавары, якія імі перамяшчаюцца. Не забываем і аб камфортным знаходжанні грамадзян у пунктах пропуску. Станоўчы вопыт работы ў нас ужо маецца: гаворка ідзе аб падрыхтоўцы і правядзенні чэмпіянату свету па хакеі, які наша краіна прымала ў 2014 годзе, а таксама чэмпіянату свету па футболе сёлета ў Расіі. Падрыхтоўка пунктаў пропуску ў самым разгары: арганізоўваюцца асобныя каналы для спрошчанага перасячэння мяжы, абнаўляюцца матэрыяльна-тэхнічныя сродкі, неабходныя для забеспячэння бяспекі ў перыяд гульняў, адпрацоўваюцца тэхналогіі спрошчанага ўвозу тавараў, прызначаных для арганізацыі і правядзення спаборніцтваў».

ЧАС ЦАРЫЦЫ ПАЛЁЎ

Фота БелТА.

Сёлета кукуруза паспела на два тыдні раней, чым звычайна, і ў Гомельскай вобласці, дзе гэта культура расце найлепш, у дзесяць разоў павялічылі тэмпы яе ўборкі на зерне ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Згодна з даручэннем кіраўніка краіны, уборка кукурузы на сілас, зялёны корм і зерне павінна быць завершана да 1 лістапада. У КСУП «Ураджайнае» Лоеўскага раёна трэба ўбраць кукурузу на плошчы 315 га. Сярод тых, хто шчыруе сёння на палях прадпрыемства, — камбайнер Дзмітрый ГАНЧАРЭНКА.

КАРАТКА

- **«Белнафтахім» працягне стрыманую палітыку па змене цэн на аўтамабільнае паліва.**
- Тыдні Германіі будуць праходзіць у адзінаццаці гарадах Беларусі з 23 верасня да 18 кастрычніка.
- **У Беларусі назіраецца другі пік актыўнасці кляшчоў.**



- Працягласць цёплага перыяду з сумай тэмператур паветра вышэй за нуль да 2041—2060 гадоў у сярэднім павялічыцца ў Беларусі на 35 дзён і будзе вагацца ад 280 да 310 дзён.

■ Адукацыя для жыцця

ПАЧУЦЦЁ ГУМАРУ, АДКРЫТАСЦЬ І ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ

Якіх педагогаў хочуць бачыць дзеці ў аб'яднаннях па інтарэсах?

Для сістэмы дадатковай адукацыі ўласцівы адкладзены ў часе эфект. Пакуль яна існуе, яе ніхто быццам бы не заўважае, але як толькі яна знікне, гэта стане відаць усім і адразу. Дадатковая адукацыі не проста дапамагае знайсці сябе — яна мае магутны выхаваўчы патэнцыял, папулярызуе сярод дзяцей і падлеткаў сучасныя прафесіі, развівае іх творчыя і інтэлектуальныя здольнасці, засцерагае ад негатыўнага ўздзеяння вуліцы, ад падлеткавай агрэсіўнасці і дэструктыўных паводзін. Вопыт, праблемы і перспектывы ўстаноў дадатковай адукацыі аказаліся ў цэнтры ўвагі міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, якая прайшла на базе Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі. Сваімі напрацоўкамі з беларускімі калегамі падзяліліся педагогі з Украіны, Расіі і Кыргызстана.

СТАР. 4

■ Кадры вырашаюць усё

РАБОТА, ЗАРПЛАТА, ЖЫЛЛЁ

Тры складнікі, што дапамагаюць замацаваць маладых спецыялістаў у Любані

Гэтымі днямі ў Любані ўрачыста адкрылі новы жылы дом для ўрачоў цэнтральнай раённай бальніцы — агульнай плошчай 345 квадратных метраў. У доме пяць кватэр: трохпакаёвая, па дзве двухпакаёўкі і аднапакаёўкі адпаведна. Пакуль на будынку значыцца лічба 12. Але хутка з'явіцца таблічка з назвай «вуліца Рэспубліканская».

— У будаўніцтва і добраўпарадкаванне ўкладзена 500 тысяч рублёў. Дом з жалезабетонных канструкцый з уцяпленнем, поўнай апрацоўкай. Усе кватэры абсталяваны газавым катлом з аўтаматыкай, — паказвае **прадстаўнік субпадрадчыка — дырэктар даччынага ўнітарнага прадпрыемства «ПМК-201» УП «Мінскаблсельбуд» Мікалай ЛУЧЫНОВІЧ.**

Тэрыторыя вакол збудавання цалкам уладкаваная: асфальт, тратуарныя дарожкі, безбар'ернае асяроддзе, стаянка для аўтатранспарту, дзіцячая пляцоўка з гульнявымі атракцыёнамі, кантэйнерная пляцоўка з раздзельным зборам смецця.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ І ВЫЙГРАЙ КАРЫСНЫЯ ПРЫЗЫ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

ISSN 1990 - 763X

БОЛЬШ ЧЫМ СЯБРЫ І ПАРТНЁРЫ...

Беларусь і Кітай сталі «жалезнымі братамі»

Пра гэта заявіў беларускі лідар на сустрэчы з членам Пастаяннага камітэта Палітбюро Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Кітая, сакратаром Цэнтральнай камісіі КПК па праверцы дысцыпліны Чжаа Лэцзы.

У пачатку Аляксандр Лукашэнка павітаў Чжаа Лэцзы ў Беларусі: «Асабліва прыемна, што менавіта ў нашу краіну вы робіце першы візіт пасля абрання дзеючага складу кіраўніцтва Кампартыі Кітая», — адзначыў Прэзідэнт і павіншаваў яго з прызначэннем на высокія, адказныя партыйныя пасады.

Беларускі лідар нагадаў, што сёлета ў чэрвені ў горадзе Ціндаа ў рамках саміту Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва ён сустракаўся са Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам, дзе было абвешчана аб уступленні ў новы этап беларуска-кітайскага супрацоўніцтва. «Беларусь і Кітай, як прынята сёння казаць, сталі «жалезнымі братамі», — адзначыў Прэзідэнт.

Дарэчы, у маі ў Мінску прымалі намесніка старшыні КНР Ван Цішаня. «Рады, што няспынны дыялог на самым высокім узроўні працягваецца, захоўваючы глыбіню двухбаковых адносін. Кожная сустрэча дае новы імпульс у злучэнні развіцця нашых краін у імя пабудовы «супольнасці адзінага лёсу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар таксама дадаў, што з пункту гледжання беларускага кіраўніцтва нашы адносіны інтэнсіўныя і ўсёабдымныя, дынамічна развіваюцца. «Такой дынамікай беларускі бок задаволены. Натуральна, што на гэтым доўгім, вельмі складаным і цяжкім шляху заўсёды будуць нявырашаныя праблемы, задачы, якія трэба будзе рэалізоўваць», — канстатаваў ён.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: для Беларусі важна пачуць меркаванне Чжаа Лэцзы па якасці двухбаковага ўзаемадзеяння і кірунках яго далейшага паглыблення.

У сваю чаргу, Чжаа Лэцзы адзначыў, што вельмі рады пабываць у прыгожай краіне — у Беларусі. Ён перадаў Аляксандру Лукашэнку «самыя цёплыя прывітанні і найлепшыя пажаданні ад добрага сябра Сі Цзіньпіна». На думку члена Пастаяннага камітэта Палітбюро ЦК КПК, беларускі лідар асабіста ўнёс вялізную лепту ў развіццё беларуска-кітайскіх адносін.

Ён дадаў, што Кітай і Беларусь — добрыя сябры, якія могуць падзяліцца і радасцю, і нягодамі, таксама нашы дзяржавы — партнёры, якія заўсёды аказваюць дапамогу адзін аднаму. Па словах Чжаа Лэцзы, галоўная мэта яго візіту — «рэалізаваць кансэнсус, дасягнуты паміж кіраўнікамі дзяржаў на палях саміту ШАС у Ціндаа».

Дарэчы, рабочы візіт Чжаа Лэцзы ў Беларусь працягнецца да 22 верасня, ён праходзіць у рамках рэалізацыі Мемарандума аб супрацоўніцтве паміж Адміністрацыяй Прэзідэнта Беларусі і Міжнародным аддзелам ЦК КПК.

На парадку дня візіту члена Пастаяннага камітэта Палітбюро ЦК КПК — сустрэчы з прэм'ер-міністрам Беларусі Сяргеем Румасам, кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Наталляй Качанавай, а таксама Старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаілам Мясніковічам.

Прадугледжана і культурная праграма: наведванне Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень», Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, а таксама гісторыка-культурнага комплексу «Лінія Сталіна».

НА ПОЛІ ПЕРАГАВОРАЎ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка знаходзіцца з рабочым візітам у Сочы. Сёння там павінны адбыцца беларуска-расійскія перагаворы на найвышэйшым узроўні з удзелам членаў урада дзвюх краін, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка і яго расійскі калега Уладзімір Пуцін таксама правядуць двухбаковую сустрэчу ў фармаце «адзін на адзін». Чакаецца, што сярод тэм, якія абмяркуюць лідары, будуць сельская гаспадарка, прамысловасць, гандлёва-эканамічнае і фінансавае ўзаемадзеянне, супрацоўніцтва ў нафтагазавай сферы, а таксама інтэграцыя.

Надзея АНІСОВІЧ.

Пра гандаль і інвестыцыі

За 2017 год тавараабарот Беларусі і мацерыковага Кітая склаў 3,11 мільярда долараў ЗША (120,5 % — да 2016-га), аб'ём беларускага экспарту — 362,7 мільёна долараў (76,7 %), імпарту — 2,74 мільярда долараў (128,8 %). Сальда склалася адмоўнае ў памеры 2,38 мільярда долараў.

За студзень — ліпень 2018 года тавараабарот паміж дзвюма краінамі склаў 1,97 мільярда долараў (129 % да аналагічнага перыяду 2017 года), аб'ём беларускага экспарту — 241,2 мільёна долараў (137 %), імпарту — 1,73 мільярда долараў (128 %). Сальда адмоўнае — мінус 1,49 мільярда долараў.

Асноўныя пазіцыі экспарту: калійныя ўгнаенні, поліаміды, лён-сырэц або лён апрацаваны, малако і вяршкі згушчаныя і сухія, малочная сыроватка, рапсавы алей і электронныя інтэгральныя схемы.

Што датычыцца інвестыцыйнага супрацоўніцтва, то за 2017 год у Беларусь паступіла 275,5 мільёна долараў валавых інвестыцый з Кітая, з іх прамых — 113,6 мільёна долараў, на чыстай аснове — 39,1 мільёна долараў (за 2016-ы — адпаведна 251,2, 99,5 і 36,1 мільёна долараў).

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

■ Фінансы

ДОЛАР МОЖА ЯШЧЭ ПАТАННЕЦЬ

На мінулым валютным тыдні долар нарэшце пачаў паказваць адмоўную дынаміку. Ці зможа замацавацца гэтая тэндэнцыя на новым тыдні? І як паўплывае на курсы валют у Беларусі павышэнне ключавой стаўкі Банкам Расіі?

Азіраючыся на суседнюю валюту

У цэлым былы тыдзень выдаўся аптымістычней за папярэдні, ёсць добрыя навіны, каментуе сітуацыю **фінансавы аналітык Жанна КУЛАКОВА.**

З 11 верасня расійскі рубель пачаў умацоўвацца: за некалькі дзён — прыкладна на 3 %. Гэта досыць прыкметны «адкат» за такі кароткі час. Акрамя таго, важна, што такое назіраецца ўпершыню пасля досыць зацяжнога глыбокага падзення. Дарэчы, карэкцыя рубля наспявала даўно. Разам з тым ёсць і некаторыя аб'ектыўныя прычыны, якія прывялі да гэтага.

За апошнія дні ўмацаваліся многія валюты краін, якія развіваюцца. Гэта датычыцца не толькі расійскага рубля, але і многіх іншых валют, якія падалі апошнім часам. Асобна варта вылучыць прыклад Турцыі. Там насуперак даручэнням прэзідэнта краіны Эрдагана Цэнтрабанк нечакана павысіў ключавую стаўку, прычым вельмі прыкметна: з 17,75 % да 24 %. Турэцкая ліра ўмомант адказала на такое ўмацаваннем на 7 %. Гэтыя падзеі маглі «пацягнуць» за сабой расійскі рубель.

Варта таксама згадаць, што некалькі спадае напружанне, справакаванае гандлёвымі войнамі. ЗША прапанавалі Кітаю правесці перамовы па пытаннях гандлю — і на рынку сфарміраваліся пазітыўныя чаканні, што ўсё наладзіцца.

Узняцце ключавой стаўкі ў Расіі

У пятніцу 14 верасня расійскі Цэнтрабанк нечакана прыняў рашэнне таксама павысіць ключавую стаўку: з 7,25 % да 7,5 %. Павышэнне працэнтнай стаўкі — заўсёды фактар, які стрымлівае інфляцыю, які аказвае падтрымку нацыянальнай валюце, таму гэта таксама падтрымлівае расійскі рубель. Згаданы фактар можа працягваць працаваць яшчэ як мінімум некалькі дзён. У расійскага рубля ёсць і іншыя прычыны для ўмацавання: напрыклад, нафта, якая даражэе.

Разам з тым трэба разумець, што шмат у чым мы зноў маем справу з настроямі і чаканнямі. Аптымізм, які паўстаў у дачыненні да валют краін, што развіваюцца, можа ў любую секунду змяніцца песімізмам. Рызыкі гандлёвых войнаў, якія могуць справакаваць запаволенне глабальнага эканамічнага росту, захоўваюцца. Акрамя таго, долар пакуль дастаткова моцны. Гэта таксама не вельмі добра для валют нашых краін. Аднак змены ў дынаміцы расійскага рубля — добрая навіна для Беларусі ў любым выпадку.

Надзея ў дынаміцы

Што датычыцца далейшай дынамікі, то, на думку спецыялістаў, геапалітычныя рызыкі для расійскага рубля захоўваюцца. Усё яшчэ не вырашана пытанне з самымі непрыемнымі санкцыямі, якія могуць закрануць расійскі дзярждоўг, сістэмаўтваральныя банкі, стратэгічна важныя кампаніі. Фактар нявызначанасці можа аказваць ціск на расійскі рубель. Аднак расійскі рубель усё ж можа адыграць частку страт.

Пры такім сцэнарыі можа адбыцца рост курса расійскага рубля і на нашым рынку. Гэта спрыяльна адаб'ецца на знешнім гандлі і ў цэлым на эканоміцы. Долар і еўра пры гэтым могуць знізіцца.

Беларускі рубель умацаваўся да ўсіх трох валют, што ўваходзяць у кошык. Гэта сведчыць аб тым, што на нашым унутраным рынку прапанова замежнай валюты зноў перавысіла попыт на яе. Гэта таксама добра. Прымаючы пад увагу і знешнія, і ўнутраныя абставіны, можна з асцярожнасцю выказаць здагадку, што на новым валютным тыдні беларускі рубель можа ўмацавацца пасля досыць зацяжнога падзення.

Аднак пакуль што ў задачы занадта шмат невядомых, каб рабіць прагнозы хоць з нейкай доляй упэўненасці.

У ДЫЗАЙН БАНКНОТАЎ УНЯСУЦЬ КАСМЕТЫЧНЫЯ ЗМЕНЫ

І неўзабаве выправяць памылку ў слове «пяцьдзясят»

Праўленнем Нацыянальнага банка прынята рашэнне аб правядзенні мадыфікацыі банкнотаў, якія знаходзяцца ў абарачэнні, пры захаванні асноўных малюнкаў на пярэднім і адваротным баках, а таксама іх каляровай гамы і памеру.

Што будзе? Нацбанк у 2019 годзе выпусціць абноўленыя банкноты наміналам 5 і 10 рублёў, а ў 2020 годзе — 20 і 50 рублёў.

Што зменіцца ў рублях? Выявы архітэктурных збудаванняў на пярэдніх баках мадыфікаваных банкнотаў будуць прыведзены ў адпаведнасць з актуальным знешнім выглядам з указаннем назвы намаляваных архітэктурных збудаванняў. Таксама на мадыфікаваных банкнотах знікне подпіс былога старшыні НБ Пятра Пракаповіча.

У адпаведнасці з новай рэдакцыяй Правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі на банкноце наміналам 50 рублёў надпіс «ПЯЦЬДЗЕСЯТ» будзе выпраўлены на «пяцьдзясят».

У сувязі з тым, што на банкнотах будзе паказвацца год іх фактычнага выпуску, спатрэбілася ўнясенне змяненняў ва Указ Прэзідэнта ад 4 лістапада 2015 года № 450 «Аб правядзенні дэнамінацыі афіцыйнай грашовай адзінкі Рэспублікі Беларусь».

Цяпер Нацыянальны банк прыступіў да правядзення падрыхтоўчых мерапрыемстваў па выбары прадпрыемства-вытворцы і выпуску ў абарачэнне мадыфікаваных банкнотаў. Перад выпускам у абарачэнне банкнотаў новых гадоў выпуску Нацыянальны банк дасць падрабязную інфармацыю аб іх знешнім выглядзе і прыкметах сапраўднасці. Раней уведзеныя ў абарачэнне банкноты ўзору 2009 года будуць заставацца законным плацежным сродкам.

Патрэба ў заказе грашовай наяўнасці звязана перш за ўсё з невялікімі тэрмінамі службы банкнотаў дробных наміналаў, заканамерным павелічэннем колькасці старых банкнотаў і неабходнасцю іх замены, удакладняе прэс-служба Нацбанка. Так, пачынаючы з кастрычніка 2017 года паступленне старых банкнотаў наміналамі 5 і 10 рублёў узрасло ў 3 і 2 разы адпаведна. Са снежня мінулага года павялічылася больш чым у 2 разы паступленне старых банкнотаў наміналам 20 рублёў. Што датычыцца манет, то манеты дробных наміналаў, перш за ўсё 1 і 2 капейкі, з'яўляюцца самымі запатрабаванымі і не вяртаюцца ў касы галоўнага банка краіны. Пры гэтым іх выдача з кас Нацыянальнага банка пастаянна расце.

Сярэдні тэрмін службы банкнотаў дробных і сярэдніх наміналаў складае ад аднаго года да трох гадоў. Менавіта таму Нацыянальны банк на пастаяннай аснове ажыццяўляе заказ банкнотаў і манет, што з'яўляецца звычайнай практыкай цэнтральных (нацыянальных) банкаў па выкананні функцыі забеспячэння эканомікі наяўнымі грашыма.

У сусветнай практыцы дробныя банкноты ў большай ступені выкарыстоўваюцца як разменныя, маюць непрацяглыя тэрміны службы і таму патрабуюць пастаяннай замены. Так, сярэдні тэрмін службы банкнота наміналам 5 еўра складае 13 месяцаў, банкнота наміналам 1 долар ЗША — 22 месяцы, банкнота наміналам 50 расійскіх рублёў — 8,3 месяца.

Варта адзначыць, што дадатковы выраб наяўных грошай не азначае павелічэнне грашовай масы, паколькі іх выпуск у абарачэнне прыводзіць да пераходу грашовых сродкаў з безнаяўнай формы ў наяўную, бо банкі за атрыманыя грашовыя знакі пералічваюць Нацыянальнаму банку іх безнаяўны эквівалент.

Сяргей КУРКАЧ

РАБОТА, ЗАРПЛАТА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дом узведзены за кошт абласнога бюджэту ў сціслыя тэрміны — менш чым за год. Мясцовыя ўлады і будаўнікі імкнуліся як мага хутчэй увесці жыллё ў эксплуатацыю, паколькі яно прызначалася для маладых спецыялістаў — урачоў вузкага профілю, якіх не хапала ў раёне і якія павінны былі прыехаць на працу па размеркаванні да 1 жніўня.

Андрэй і Ксенія Зелянко закончылі Гродзенскі медыцынскі ўніверсітэт. Андрэй — неўролаг, яго жонка — гінеколаг. Абодва родам з Брэсцкай вобласці. Як прызналася маладая пара, у Любань ехалі ахвотна, бо ведалі, што ім тут гарантавана першае месца працы і прасторная кватэра плошчай 77 квадратных метраў. «З перспектывай для папаўнення сям'і», — пажартаваў Андрэй. Пакуль маладая сям'я паціху закупляе мэблю, абжываецца.

Яўген Схаўко атрымаў спецыяльнасць псіхіятра-нарколага ў Віцебскім медуніверсітэце. Праз два гады яго жонка там жа атрымае дыплом псіхатэрапеўта, і маладая сям'я аб'яднаецца. У аднапакаёвыя кватэры засяліліся рэнтгенолаг Вадзім Нікіфарэнка і нарколаг Галіна Грыгарэвіч. Яўгенія і Мікіта Дрэнчыкі ў Любані ўжо два гады. Прыехалі па размеркаванні пасля заканчэння Гродзенскага медуніверсітэта, ды так і засталіся. За гэты час Мікіта стаў намеснікам галоўнага ўрача бальніцы. Яўгенія ў дэкрэтным водпуску, рыхтуецца стаць мамай. Маладыя атрымалі ключы ад двухпакаёвай кватэры.

— Мая задача — утрымаць маладых спецыялістаў, — кажа **галоўны ўрач Любанскай цэнтральнай раённай бальніцы Андрэй АМШАРУК.** — А ўтрымаць моладзь можна не толькі дастойнай зарплатай, належнымі ўмовамі працы, але і жыллём. Мяркую, што навічкі замацуюцца на сваіх пасадах, застануцца жыць і працаваць у Любані.

Сёлета ў раённую бальніцу прыбыло 12 медыкаў. Практычна няма праблемы з урачамі — штат укамплектаваны на 86 %. На сёння не хапае спецыялістаў пярвічнай медыка-санітарнай дапамогі і педыятраў. Сёлета ў вышэйшыя медыцынскія ўстановы з райцэнтра паступіла пяць чалавек. Пасля заканчэння вучобы яны вернуцца ў Любань.

— Гэты дом здадзены маладым спецыялістам-урачам, у якіх меў патрэбу горад. Яшчэ на этапе вучобы ў медустановах з імі былі заключаны мэтавыя дагаворы аб тым, што яны прыедуць да нас працаваць, а мы паабяцалі забяспечыць іх добраўпарадкаваным жыллём, — расказаў **старшыня Любанскага райвыканкама Сяргей КАЗЕЦКІ.** — Гораду неабходны не толькі медыкі, але і трэнеры па плаванні, харэографы, выкладчыкі ва ўстановы адукацыі ды іншыя. Таму ў далейшым будзем будаваць і прапаноўваць жыллё тым спецыялістам, якія запатрабаваныя ў Любані.

— Дом пад нумарам 12 — толькі першая ластаўка. На гэтым зямельным участку ў недалёкай перспектыве з'явіцца яшчэ 24 арэндныя кватэры. Жылая забудова будзе прадстаўлена аднапавярховымі дамамі, максімум — двухпавярховымі. Для гэтага ёсць усе падставы: уладкаваныя інфраструктура, дарогі, пабудаваны магазін, плануецца ўзвядзенне дзіцячага садка.

Цяпер у Любані налічваецца 12 тысяч насельніцтва. На горна-абагачальным камбінаце будзе працаваць 1800—2000 чалавек. Зразумела, што спецыялісты прыедуць сюды з сем'ямі, дзецьмі. Па папярэдніх падліках, райцэнтр прырасце шасцю тысячамі навасёлаў. Да іх прыёму тут карпатліва рыхтуюцца. Ідзе актыўнае будаўніцтва жылля, інфраструктуры, пракладваюцца цеплавыя, кабельныя сеткі, водаправод. Работы вядуцца ў комплексе, распрацаваны перспектыўны план развіцця горада, цалкам падрыхтаваны план дэталёвай забудовы на канкрэтных месцах. Сёлета плануецца ўвесці 7,5 тыс. квадратных метраў жылля. Па меры паступлення новай рабочай сілы будзе набіраць абароты і будаўніцтва. Прадугледжваюцца як малапавярховыя, так і шматпавярховыя будынкі. Мясцовае кіраўніцтва выйшла ў вышэйшыя інстанцыі з прапановай дазволіць узвядзенне 9-павярховікаў.

Новаму камбінату спатрэбяцца спецыялісты горнай справы, якіх у сельскай мясцовасці няма. Таму «Слаўкалій» клапоціцца аб прыцягненні такой катэгорыі работнікаў. У сваю чаргу райвыканкам падбірае тых людзей, якія будуць забяспечваць абслугоўванне і жыццядзейнасць горада. А прыцягнуць і замацаваць кадры можна не толькі жыллём, паколькі не хлебам адзіным жыве чалавек.

— У нас створаны ўмовы, каб людзі змаглі задаволіць свае сацыяльныя, культурныя патрэбы, змястоўна адпачыць, рэалізаваць творчыя магчымасці, раскрыць таленты, — кажа **намеснік старшыні райвыканкама Тамара ДАМАШЭВІЧ.**

Жыхары маюць магчымасць наведаць басейны гарадскога фізкультурна-аздараўленчага цэнтра і спартыўнага комплексу аграгарадка Сарачы. Пры раённым Доме культуры працуе тэатральны калектыў. Два гады таму добраўпарадкавалі гарадскі парк культуры і адпачынку. Можна цікава правесці вольны час, вечарыну ва ўстановах грамадскага харчавання — як райспажыўсаюза, так і ў прыватных. Славіцца Любаншчына і інтэлектуальным турнірам «Што, дзе, калі», фестывалем «Клуб вясёлых і знаходлівых». Тут знойдуць занятак па сваім густе як малады спецыяліст, так і сталы прафесіянал.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ,

Час для размоў

Традыцыйныя прамыя лініі адбудуцца ў суботу, 22 верасня, у Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах. Тэлефонныя лініі з 9.00 да 12.00 правядуць:

кіраўнік спраў БРЭСЦКАГА аблвыканкама Георгій Мікалаевіч ХВАЛЬКО. Тэл. 8-016 221 31 21;

старшыня ВІЦЕБСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч Цярэнцьеў. Тэл. 8-021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч ГАРБАЧОЎ. Тэл. 8-023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Алена Аляксандраўна БУБЕНЧЫК. Тэл. 8-015 273 56 44;

першы намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Алег Іванавіч ЧЫКІДА. Тэл. 8-022 250 18 69;

першы намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Ігар Мікалаевіч МАКАР. Тэл. 8-017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Віктар Сяргеевіч ЛАПЦЕЎ. Тэл. 8-017 222 44 44.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

СМІ назвалі прозвішчы магчымых пераемнікаў Тэрэзы Мэй

Брытанскія кансерватары склалі пералік дзяржаўных дзеячаў, якія, на іх думку, маглі б заняць пасаду прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі пасля таго, як яе пакіне Тэрэза Мэй. Пра гэта са спасылкай на службовую запіску, якая апынулася ў распараджэнні рэдакцыі, паведамляе газета The Telegraph. Дакумент, па інфармацыі выдання, распаўсюджваецца сярод кансерватыўных членаў парламента. Згодна з ім, аднапартыйцы Мэй плануюць прапанаваць ёй адстаўку «неўзабаве пасля сакавіка 2019 года». 29 верасня Вялікабрытанія ў рамках «брэксіта» павінна канчаткова пакінуць Еўрасаюз. Пасля гэтага, як указваецца ў распаўсюджваемай кансерватарамі паперы, павінен будзе «неадкладна» адбыцца нейкі «манеўр».

Затым у службовай запісцы пад загалоўкам «кандыдаты ў кабінет міністраў» пералічаны прозвішчы вядомых палітыкаў Вялікабрытаніі. Telegraph называе іх «магчымымі пераемнікамі Мэй на пасадзе прэм'ер-міністра». Гэта былы міністр па выхадзе Брытаніі з ЕС Дэвід Дэвіс, міністр міжнароднага гандлю Ліам Фокс, брытанскі міністр навакольнага асяроддзя, харчавання і сельскай гаспадаркі Майкл Гоув, канцлер казначэйства Філіп Хэманд, міністр аховы здароўя Мэцью Хэнкак, міністр адукацыі Дэміян Хайнс, кіраўнікі МЗС і МУС краіны Джэрэмі Хант і Саджыда Джавід, экс-міністр замежных спраў Брытаніі Борыс Джонсан.

Трамп назваў самую горшую памылку ЗША за ўсю гісторыю дзяржавы

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп назваў найгоршую памылку сваёй дзяржавы за ўсю гісторыю. Паводле яго слоў, гэта — увядзенне амерыканскіх войскаў на Блізкі Усход, ажыццёўленае адным з яго папярэднікаў Джорджам Бушам-малодшым. Пра гэта Трамп заявіў у інтэрв'ю The Hill.

«Хоць Абама, магчыма, паступіў няправільна, вывеўшы адтуль салдат, але ўводзіць іх туды было, на маю думку, самая вялікая памылка, якую калі-небудзь здзяйснялі ў гісторыі нашай краіны», — сказаў Трамп. Ён растлумачыў, што ЗША патрацілі на блізкаўсходнюю кампанію 7 трыльёнаў долараў, а чалавечыя страты з абодвух бакоў вылічаліся мільёнамі. «Мільёны жыццяў», — падкрэсліў прэзідэнт.

Выданне прыводзіць даныя Пентагона: па ацэнцы абароннага ведамства, выдаткі на баявыя дзеянні ў Іраку, Афганістане і Сірыі з 2001 да 2018 года склалі 1,52 трыльёна долараў. Аднак Браўнаўскі ўніверсітэт прыводзіць іншую лічбу: 5,6 трыльёна (па стане на верасень 2017 года).

У кастрычніку 2001 года, неўзабаве пасля падзей 11 верасня, Джордж Буш-малодшы, які займаў тады пасаду прэзідэнта, загадаў увесці войскі ў Афганістан, дзе, па звестках разведкі ЗША, хаваўся верхавод «Аль-Каіды» Усама бен Ладэн. Праз два гады амерыканскі лідар ініцыяваў нападзенне на Ірак з мэтай звяржэння рэжыму Садама Хусэйна.

Дзярждэпартамэнт: колькасць тэрактаў у свеце скарацілася ў 2017 годзе на 23 %

Такія звесткі прыводзяцца ў чарговым штогадовым дакладзе аб праблемах барацьбы з тэрарызмам у свеце, які быў падрыхтаваны Дзяржддэпартаментам. Гэтае даследаванне ахоплівае 2017 год. «Агульная колькасць тэрарыстычных нападаў у свеце ў 2017 годзе зменшылася на 23 %, а агульная колькасць смерцяў у выніку тэрактаў — на 27 % (у параўнанні з 2016 годам)», — гаворыцца ў дакументе. Яго аўтары прызнаюць, што гэтая станоўчая тэндэнцыя зафіксаваная ў асноўным дзякуючы толькі аднаму фактару — рэзкаму скарачэнню колькасці ахвяр тэрактаў у Іраку.

У адпаведнасці з выкладзенымі ў справаздачы данымі, тэракты былі здзейснены летась у цэлым у 100 дзяржавах. Аднак яны былі геаграфічна сканцэнтраваныя: 95 % з іх прыйшліся ўсяго на пяць краін — Афганістан, Індыю, Ірак, Пакістан і Філіпіны. Акрамя таго, 70 % усіх смерцяў ад рук тэрарыстаў былі зарэгістраваныя таксама ў пяці дзяржавах — Афганістане, Іраку, Нігерыі, Сірыі і Самалі.

У найлепшых традыцыях гасціннасці

Ужо заўтра аграгарадок Ляскавічы Петрыкаўскага раёна ператворыцца ў сталіцу Палескага краю — вялікай тэрыторыі, якая аб'яднае восем раёнаў Гомельшчыны і тры — Брэстчыны, а таксама прадстаўнікоў Чарнігаўскай, Бранскай абласцей і шматлікіх гасцей з розных краін у V Міжнародным фестывалі этнакультурных традыцый «Кліч Палесся».

Фота БелТА.

Паводле слоў кансультанта ўпраўлення культуры і народнай творчасці Мінкультуры Івана ГАЛАБУРДЫ, фестываль, які ладзіцца з 2010 года, «за гады свайго існавання вызначыўся як адметная, яркая з'ява міжнароднага ўзроўню». Менавіта таму ён змяніў статус з рэгіянальнага спачатку на рэспубліканскі, а потым — і на міжнародны. Напрыклад, сёлета сярод яго ўдзельнікаў не толькі палешукі з Беларусі, Расіі і Украіны, але таксама і творчыя калектывы, якія прадстаўляюць самабытную культуру Польшчы і нават Індыі.

І ўсё ж базай, фундаментам свята быў і застаецца культурны матэрыял Палесся, у збіранні і захаванні якога арганізатарам фестывалю вялікую дапамогу аказваюць этнографы, самадзейныя і прафесійныя творчыя аб'яднанні з розных рэгіёнаў. Так, сёлета, расказвае галоўны рэжысёр фэсту «Кліч Палесся» Аляксандр БАНДАРЭНКА, праграма грунтуецца на традыцыйным палескім вяселлі, у карагод якога плануецца ўключыць абсалютна ўсіх — і больш як 1000 артыстаў, і стваральнікаў рэгіянальных падворкаў, і гасцей. Кожны з 11 падворкаў-удзельнікаў, дарэчы, будзе пайменаваны ў гонар канкрэтнай вёскі са свайго рэгіёна, а наведвальнікам прапануе тэатралізаваную версію паходжання гэтых назваў: Якімы, Булаўкі, Каўпак-Гара... Больш за 20 самадзейных калектываў Гомельскай і Брэсцкай абласцей возьмуць удзел у праекце «Сярод вёскі карагод», які прадставіць як мясцовыя, так і шырока вядомыя народныя бытавыя танцы ды гульні. У месцічаў і турыстаў, між іншым, будзе магчымасць развучыць з дапамогай прафесіяналаў папулярны народны танец «Лысы», ён жа «Карапет». А на свяце народных тэатраў «Батлейка.by» можна будзе не толькі паглядзець прадстаўленні, але і паспрабаваць уласнаручна змайстраваць тэатральныя лялькі ці рэквізіт.

«На адкрыцці фестывалю, як заўжды, адбудзецца ўручэнне сімвалічных статуэтак і званняў «Ганаровы паляшук». Сёлета яго ўладальнікамі стануць адразу два чалавекі», — расказвае першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Інга Заўгародняя. Сярод іншых цікавінак праграмы — рыцарская рэканструкцыя «Бітва эпох», прэзентацыя праекта рэгіянальных брэндаў «З любоўю да Гомельшчыны», работа пляцоўкі «Кіно на траве», свята «Танчым па-даўнейшаму» (летась найстарэйшаму яго ўдзельніку было 76 гадоў, а найменшаму — 6, і гэта, мяркуюць арганізатары, далёка не мяжа).

Цэлы дзень на розных пляцоўках знойдзецца што паглядзець — як на экспазіцыі падворкаў, што расцягнецца больш чым на 1,5 кіламетра ўздоўж Прыпяці, так і на конкурсе дзявочага хараства «Палеская прыгажуня — 2018», паказальных выступленнях па конным спорце, выстаўцы «Фестываль кнігі і прэсы». У амаль дзвюхгадзіннай канцэртнай праграме разам з творчымі калектывамі раёнаў і абласцей выступяць леташнія ўдзельнікі «Еўрабачання», гурт NaviBand, і нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам маэстра Міхаіла Фінберга (дарэчы, таксама ганаровага палешука). Калі дазволіць надвор'е, шаноўную публіку ўразяць відовішчнымі выступленнямі дэльтапланерысты і парашутысты. Завершаць жа фэст, як плануецца, маладзёжная шоу-праграма з удзелам гурта «Дразды», святочны феерверк і танцавальна-забаўляльная праграма.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ПАЧУЦЦЁ ГУМАРУ, АДКРЫТАСЦЬ...

Права, а не абавязак

Сёння ў краіне дзейнічаюць 284 установы дадатковай адукацыі (гэта менш, чым было, скажам, яшчэ некалькі гадоў таму) з агульнай колькасцю навучэнцаў больш за 390 тысяч чалавек. Ахоп дадатковай адукацыяй школьнікаў складае 58 працэнтаў.

— Жыццё ў сучасным грамадстве патрабуе ад маладых людзей гнуткасці ў паводзінах і ўмення хутка адаптавацца да сітуацыі, якая пастаянна змяняецца. Гнуткай і мабільнай павінна быць і сістэма дадатковай адукацыі, каб хутка і кропкава рэагаваць на сучасныя адукацыйныя запыты, адпавядаць чаканням дзяцей і моладзі, — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі **начальнік галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Эдуард ТАМІЛЬЧЫК.** — Заняткі ў сістэме дадатковай адукацыі дазваляюць выхаванцам адчуць сябе паспяховымі, што павышае іх самаацэнку, набыць уласны ўнікальны досвед, паспрабаваць рэалізавацца ў розных сферах дзейнасці. Там яны знаходзяцца ў сяброўскім асяроддзі. Цяжка пераацаніць і ролю педагога дадатковай адукацыі.

«Псіхолагі лічаць, што бацькі ні ў якім разе не павінны аказваць ціск на сваё дзіця пры выбары таго ці іншага гуртка, клуба або секцыі. Толькі занятак па душы можа прынесці рэальную карысць».

Ні для каго не сакрэт, што паміж школьным настаўнікам і педагогам дадатковай адукацыі існуе прынцыповая розніца. Калі першага дзеці не выбіраюць, а хадзіць у школу па веды — гэта іх, так бы мовіць, галоўная жыццёвая задача і нават абавязак, то прымусіць дзяцей наведваць гурток ці секцыю, калі ім там нецікава, проста немагчыма. Педагогаў, пад кіраўніцтвам якіх яны займаюцца сваёй любімай справай, дзеці выбіраюць сабе самастойна. Яны вельмі тонка адчуваюць фармалізм і не даруюць абыякавасці дарослым.

— Відавочна, што ў сістэме дадатковай адукацыі ўжо недастаткова быць проста добрым спецыялістам у той ці іншай сферы творчай дзейнасці. Важна сфарміраваць асобу дзіцяці, уцягваючы яго ў сумесную творчасць, — падкрэслівае **дырэктар рэспубліканскага вучэбна-метадычнага цэнтра эстэтычнага выхавання «Балажан» (г. Бішкек, Кыргызстан) Дарыя МУСІНА.** — Педагог дадатковай адукацыі XXI стагоддзя павінен прапанаваць новыя творчыя падыходы да выхавання і адукацыі маладога пакалення. Праведзенае намі даследаванне паказала, што для дзіцяці важна, каб педагог быў адкрыты для стасункаў (пра гэта з 300 апытаных дзяцей заявілі 56 %), мог падтрымаць у цяжкую хвіліну (58 %), добра ведаў сваю справу (72 %), валодаў пачуццём гумару (43 %), быў мабільны, умеў здзіўляцца і здзіўляць (61 %). А для бацькоў выхаванцаў важнай аказалася патрэба педагога ў пастаянным прафесійным

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

самаўдасканаленні (на гэта ўказалі 78 працэнтаў апытаных), яго гатоўнасць ісці насустрач дзіцяці (81 %), высокі ўзровень майстэрства ў той сферы, дзе ён выкладае (93 %).

Інавацыйныя кірункі

Хтосьці лічыць заняткі ў гуртках і аб'яднаннях па інтарэсах не больш чым хобі або проста баўленнем часу, але для многіх яны вызначылі прафесійны выбар на ўсё жыццё. І нават калі маладыя людзі ў выніку выбіраюць іншы кірунак сваёй прафесійнай самарэалізацыі, яны ўсё роўна больш прыстасаваныя да жыцця, і тыя здольнасці, якія яны развівалі ў аб'яднаннях па інтарэсах, абавязкова дапамагаюць ім у іншых сферах.

Між іншым педагогам, якія працуюць у аб'яднаннях па інтарэсах, не вельмі падабаецца сам тэрмін «дадатковая адукацыя»: маўляў, няправільна разглядаць гэтую сферу як нейкі дадатак да асноўнай адукацыі. Таму яны пазіцыянуюць сваю галіну як адукацыю для жыцця. Той жа турызм — гэта яшчэ і цудоўная школа выжывання, уменне жыць у калектыве, працаваць у камандзе...

Дырэктар Рэспубліканскага цэнтра інавацыйнай і тэхнічнай творчасці Сяргей САЧКО лічыць галоўнай задачай дадатковай адукацыі зрабіць усё, каб выпускнікі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі былі запатрабаваныя ў новых умовах. Сучасны рынак працы патрабуе развіцця інжынернага мыслення. Таму сёння ў цэнтры прадстаўлены такія новыя кірункі, як нейрапілатаванне, прататыпаванне, тэхналогіі беспілотных лятальных апаратаў, графічны вэб- і інжынерны дызайн, сістэмнае адміністраванне, дапоўненая рэальнасць, якія знаходзяцца на стыку фізікі, мікраэлектронікі, мехатронікі, штучнага інтэлекту, механікі і праграмавання. Эксперыментальна-інавацыйная дзейнасць на цяперашні момант — адзін з самых актуальных кірункаў развіцця дадатковай адукацыі.

Прафарыентацыя па-за школай

Па словах **дырэктара Рэчыцкага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Святланы ЧЫГРЫНЁВАЙ,** іх выпускнікі штогод выбіраюць прафесію па профілі аб'яднанняў па інтарэсах. А некаторыя з іх ужо вярнуліся ў Цэнтр і цяпер з'яўляюцца педагогамі дадатковай адукацыі.

— У нас створаны ўсе ўмовы для самарэалізацыі і прафесійнага самавызначэння навучэнцаў, — запэўнівае яна. — Сёлета асабліва ярка склаўся «прафарыентацыйны» шлях выхаванак майстэрні моды і стылю «Шэй дэ Пары», якія сталі абсалютнымі пераможцамі на абласным этапе рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства JuniorSkills Belarus у намінацыі «Дызайн і мадэляванне адзення». Усе тры прызавыя месцы былі занятыя нашымі навучэнцамі. А на рэспубліканскім этапе яны заваявалі дыплом III ступені. Адна з дзяўчынак ужо стала навучэнкай Мінскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа швейнай вытворчасці па прафесіі «Закройшчык, кравец».

Штогод на базе Рэчыцкага цэнтра творчасці арганізоўваюцца летнія прафарыентацыйныя лагеры дзённага знаходжання. Кожны кабінет у Цэнтры мае свой прафарыентацыйны пашпарт аб'яднання. Навучэнцы і бацькі могуць у свабодным доступе азнаёміцца з інфармацыяй пра тое, дзе можна працягнуць навучанне па профілі гуртка і якую кваліфікацыю атрымаць.

Найважнейшы складнік дзейнасці Рэчыцкага цэнтра — гэта аказанне дапамогі ў прафесійным самавызначэнні не толькі навучэнцам Цэнтра, але і падлеткам і моладзі ўсяго горада і раёна. На гэта быў нацэлены праект «Турагенцтва шостага дня», які рэалізоўваўся ва ўзаемадзеянні з установамі агульнай сярэдняй адукацыі. Адным з пунктаў падарожжаў па планеце Шостага дня была «PR — Прафесійная Рэспубліка». Асноўная ідэя — знаёмства дзяцей 10—14 гадоў з рознымі прафесіямі. А для старшых школьнікаў быў створаны асобны праект пад назвай «Акадэмія ўніверсальных прафесіяналаў».

Дарэчы, псіхолагі лічаць, што бацькі ні ў якім разе не павінны аказваць ціск на сваё дзіця пры выбары таго ці іншага гуртка, клуба або секцыі. Толькі занятак па душы можа прынесці рэальную карысць. А вызначыцца з выбарам адразу могуць не ўсе. Знаходзіцца ў працэсе пошуку — гэта нармальны стан любога дзіцяці, якое жадае самарэалізавацца. Бо, напэўна, не ўсім дадзена стаць інжынерам ці канструктарам, захапіцца арніталогіяй або касмічнай біялогіяй, скалалажаннем ці турызмам. Дзесьці патрабуецца максімальная канцэнтрацыя і ўважлівасць, а дзесьці, наадварот, трэба быць разняволеным... У сілах бацькоў дапамагчы дзіцяці, штосьці яму падказаць, параіць, але іх погляды і жыццёвы вопыт не павінны быць вырашальнымі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Надвор'е

ВЕСТКІ З БАЛТЫКІ: РЭЗКА ПАХАЛАДАЕ І ДОЖДЖ

Тэмпература знізіцца да плюс трох градусаў ноччу, удзень — да 12—18 цяпла

Пагаршэнне ўмоў надвор'я і пахаладанне чакаецца ў нашай краіне ў наступныя выхадныя, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У пятніцу захаваецца цёплае надвор'е. Максімальная тэмпература будзе 23—28 цяпла. Прагназуецца пераменная воблачнасць, пераважна без ападкаў.

Пад уплывам атмасферных франтоў, якія ссоўваюцца з Заходняй Еўропы ў наш бок, краіна апынецца ў суботу. А вось за франтамі пачне паступаць халодная паветраная маса. Чакаецца пагаршэнне ўмоў надвор'я і паніжэнне тэмпературнага фону. Уначы па паўночным захадзе краіны, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы. У дзённы час па ўсходзе краіны месцамі прагрымяць навальніцы. Вецер паўднёвы з пераходам на заходні, умераны, днём у асобных раёнах па ўсходзе краіны моцны парывісты. Тэмпература паветра мінімальная ўначы будзе ад плюс 11 да плюс 16 градусаў, а максімальная ўдзень усталюецца ў межах 14—19 цяпла, толькі ва ўсходніх раёнах 20—27 градусаў са знакам плюс.

Паводле інфармацыі сіноптыкаў, у нядзелю краіна будзе знаходзіцца пад уплывам халоднай і няўстойлівай паветранай масы, якая паступае з Балтыйскага мора. Чакаецца халаднаватае надвор'е. Уначы пераважна па ўсходняй палове, днём месцамі па краіне кароткачасовыя дажджы. Вецер заходні ўмераны, днём у асобных раёнах па паўночным захадзе моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы будзе апускацца да 3—10 цяпла, а днём складзе ад плюс 12 да плюс 18 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ

■ Факт

ЛЬВОЎ КНІЖНЫ ВІТАЕ БЕЛАРУСЬ!

Амаль тыдзень у галоўным горадзе Заходняй Украіны праходзіць 25-ы форум выдаўцоў. Разам сабраліся кніжнікі не толькі з Украіны, але і з суседніх краін. І таксама — з Беларусі.

Галоўная пляцоўка для экспазіцыі кніжных навінак — Палац Мастацтваў па вуліцы Каперніка, 17. У форуме, які можна лічыць галоўным кніжным кірмашом Украіны, — сотні прэзентацый, сустрэчы з вядомымі пісьменнікамі, кніжнымі графікамі, выдаўцамі. Прадстаўнічая беларуская дэлегацыя на гэтай прэстыжнай сустрэчы кніжнікаў правядзе шэраг прэзентацый, пазнаёміць з рознымі навінкамі ў кнігавыданні Беларусі. Наўмысна да форуму паліграфічны камбінат імя Якуба Коласа супольна з выдавецтвам «Мастацкая літаратура» выпусцілі невялічкую анталогію паэзіі Заходняй Украіны ў перакладзе на беларускую мову — «На арэлях натхнення». Гэтым праектам адкрылася новая кніжная серыя — «Сябрына: паэзія Украіны». Сярод твораў, змешчаных у кнізе, — плён працы беларускіх перакладчыкаў розных пакаленняў: Уладзіміра Караткевіча, Язэпа Семяжона, Васіля Зуёнка, Сяргея Панізніка, Уладзіміра Марука і шмат яшчэ каго. Таксама беларускія выдаўцы прывезлі ў Львоў дзве кнігі вядомага сучаснага ўкраінскага празаіка Міхайлы Слабашпіцкага, выдадзеныя па-беларуску ў Выдавецкім доме «Звязда». На беларускім стэндзе — і кніга Тараса Шаўчэнкі, якая нядаўна з'явілася ў выдавецтве «Мастацкая літаратура».

Беларускія кнігавыдаўцы спадзяюцца, што ўдзел у львоўскім кніжным форуме паспрыяе больш шырокім стасункам паміж пісьменнікамі і выдавецтвамі Беларусі і Украіны.

Сяргей ШЫЧКО.

АДКРЫТЫ СЕЗОН СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ КІРМАШОЎ

Восеньскі сезон кірмашоў распачаўся ў краіне яшчэ 15 верасня: на 197 пляцоўках па ўсіх раёнах арганізаваны выязны гандаль. Самыя масавыя пройдуць у Мінску каля Палаца спорту і «Чыжоўка-Арэны» з 22 верасня.

— Першай свой ураджай пакажа Гродзенская вобласць, — расказала **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама Вольга ГАЎРЫЛЬЧЫК.**

— Цэнтральнай стане пляцоўка каля Палаца спорту. З 9.00 да 16.00 Гродзенскі мясакамбінат, Дзятлаўскі сыраробны завод, Шчучынскі масласырзавод, ААТ «Навагрудскія дары», «Гроднахлебпрам» і іншыя прадпрыемствы рэгіёна, рыбаводныя і сялянска-фермерскія гаспадаркі, арганізацыі спажывецкай кааперацыі прадставяць тут сваю прадукцыю.

Мінчане змогуць набыць агародніну і садавіну ўраджаю 2018 года, кансервы, малочныя прадукты, мяса, каўбасныя вырабы, рыбу, мёд, нехарчовыя тавары. Пакупкі ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, інвалідам I групы, грамадзянам, старэйшым за 80 гадоў, даставяць дадому бясплатна. Валанцёры БРСМ не адмовяць і астатнім людзям у сталым узросце, якім будзе цяжка данесці пакупкі да прыпынку ці да дома. 29 і 30 верасня кірмашовыя гандлёвыя рады разгорнуцца на паркоўцы каля «Чыжоўка-Арэны» і збяруць вытворцаў сельгаспрадукцыі Магілёўскай вобласці. 6—7 кастрычніка прадставіць сваю прадукцыю Мінская вобласць, 13—14 — Брэсцкая, праз тыдзень — Гомельская, а там і Віцебская. 3—4 лістапада будуць прадстаўлены ўсе рэгіёны краіны. Вытворцы абяцаюць, што іх цэны будуць ніжэйшыя, чым у крамах.

Адметным сёлета з'яўляецца і тое, што ўпершыню свае вырабы змогуць прадставіць звычайныя жахары. Яны парадуюць пакупнікоў хлебабулачнай прадукцыяй, паведамляюць у Мінгарвыканкаме.

Маргарыта ГАЙДАРЖЫ

■ Жыццёвінкі

НЕ БЕЗ ДОБРЫХ ЛЮДЗЕЙ

ДЗЕ МІШКУ ШУКАЦЬ?

Перад жанчынамі паважанага веку, якія звычайна бавяць перадвечаровы час на лаве перад нашым пад'ездам, надоечы з'явілася незнаёмая бабулька і, акінуўшы прысутных на лаве ўважлівым позіркам, ціха павіталася. Пятроўна (яна сядзела з краю) пасунулася і прапанавала незнаёмцы сесці.

— Дзякуй, — адказала тая. — Няма калі сядзець. Я мужчыну шукаю...

Нашы кабеты адразу ж засмяяліся. А ўсё тая ж Пятроўна (яна, дарэчы, ніколі па слова ў кішэнь не палезе), пачуўшы такое ад незнаёмай бабулі, ажно разінула рот ад пачутага, а потым на адным дыханні выпаліла:

— Гляньце вы на яе, чаго захацела! Шустрая, аднак! Дзе ты тут знойдзеш таго мужчыну? Мы, думаеш, чаму сядзім? Проста так? Ды не, родненькая! Сядзім вось і чакаем: можа, які мужычок і прыб'ецца, клюне. А яны вунь ходзяць, халера на іх, ды ўсё міма. А? Нуль увагі! Так што наўрад ці знойдзеш ты тут сабе мужчыну...

Пасмяялася разам з усімі і бабулька. Па ўсім было відаць, што яна ў ладзе з гумарам.

— Ты б усё ж прысела, — паказала на край лавы Ігнатаўна. — У нагах праўды няма. Ды і ці мала мы настаяліся? Сядай, сядай.

— Сяду, угаварылі, — здалася ўсё ж бабулька. — Гэта ж я шукаю мужчыну...

— Яна зноў за сваё! — прытворна абурылася Пятроўна. — Ну і настойлівая! Такая знойдзе! Яна нас абставіць! — А потым, прыняўшы спакойны выгляд, сур'ёзна папытала: — Ну дык што там у цябе? Якія праблемы?

І ўсе наважыліся слухаць.

— Гэта ж па такой справе я тут, — кашлянуўшы і паправіўшы «бульку» на сівенькай галаве, пачала госця. — Тры дні назад ехала ад сястры з Барысава праз Мінск, яна, Галька, там даўно жыве, ага... А на вакзале цап: няма білета. Быў жа. Што рабіць? Як быць? Хоць гвалтам крычы. А тут падыходзіць да мяне мужчына, ён жа бачыць, у якім я становішчы... Пытае, што і як. Аказалася, землякі. Ён мяне нібы з таго свету вярнуў...

— Свет не без добрых людзей, — узрадавалася Ігнатаўна.

— А ў мяне грошай, скажу вам шчыра, не хапала на білет: усяго тры рублі засталося, — працягвала бабулька. — Ён і выручыў. Мы ж, кажа, землякі, гамяльчане. Яшчэ і ў чарзе пастаяў і сам купіў білет мне. Дык а як жа, кажу, добры чалавек, я табе доўг аддам? Спытай, кажа, Мішку, я ў першым доме па Яфрэмава жыву.

— Правільна, у нас першы дом, — падала зноў голас Пятроўна.

— Дык а хто ж у нас тут Мішка? — задумалася Ігнатаўна.

Госця падказала:

— Во яшчэ! Я, кажа, пенсіянер, рабіць няма чаго, то часта піва п'ю, там у нас побач бар. Сталы на вуліцы... Няма яго каля сталоў. Пыталася і прыглядалася.

На лаве доўга ламалі жанчыны голаў, дзе б знайсці таго Мішку, і нічога не прыдумалі. Перабралі ўсіх мужчын, якія жывуць у іх доме: няма!

Развітаўшыся, госця падзякавала і пайшла шукаць далей. Ці знойдзе? Цяжка сказаць. Але што ёсць такія вось Мішкі і такія бабулькі — гэта я дакладна ведаю. Свет сапраўды не без добрых людзей.

У МАРШРУТЦЫ

На чарговым прыпынку ў салон маршруткі важна зайшоў хлапчына ў джынсах і майцы, на якой было напісана штосьці на замежнай мове. І ў акулярах ад сонца. Адразу ж цопнуўся каля мяне, зняў акуляры, хукнуў на шкельцы, затым працёр іх насоўкай і зноўку насунуў на востранькі носік. Звярнуў увагу, што ён не думаў разлічвацца з кіроўцам. Мо знаёмы ці наогул сваяк? Дык у такіх выпадках вітаюцца хоць бы кіўком галавы. Ці за руку патрымаюцца. Гэтага не адбылося. Ды ён нават не глянуў у бок кіроўцы. Ну, едзе сабе малады чалавек і едзе. Шчаслівай, як кажуць, дарогі. Кіроўца ж, відаць, таксама звярнуў увагу, што не ўсе разлічыліся, таму нагадаў:

— Усе заплацілі?

Маўчанне.

На чарговым прыпынку ў салон увайшла мама з дачушкай гадоў пяці. Мама хацела ўзяць малую сабе на калені, але тая рашуча тузанула яе за рукаў:

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Пусці! Я сама сяду! Я прынцэса!..

На малую азірнуліся амаль усе пасажыры маршруткі: што там за прынцэса такая?

— Каця! Табе не сорамна? — у маці запунсавеліся шчокі. — Сядай, сказала!

Малая і не думала слухацца маці, працягвала канючыць:

— Я прынцэса! Я прынцэса!..

Адна з жанчынак паспрабавала зрабіць малой заўвагу, але дарэмна сарамаціла яе. Маці давялося ўступіць. Паколькі месцаў у салоне вольных больш не было, то малая сядзела, а маці стаяла каля яе, трымаючыся за поручань.

Насупраць мяне сядзеў хлопчык такога ж, відаць, узросту, як і тая «прынцэса», і калі дзядуля чхнуў, ён спарадзіраваў старога. Трэба было бачыць, як прафесійна ён зрабіў гэта. Дзядуля чхнуў яшчэ раз, і малы, увайшоўшы ў ролю, чхнуў таксама. На гэта раз пад воплескі тых, хто бачыў і ацаніў яго артыстызм. Пасажыры, падобна, адразу ж забыліся пра «прынцэсу». Незапланаванае выступленне хлопчыка падабалася куды больш!

На чарговым прыпынку хлапчына ў джынсах, майцы і акулярах выйшаў, так і не перадаўшы грошы за праезд.

Маршрутка паехала далей. Я ўважліва назіраў за тым, што рабілася ў салоне, які нагадаў сцэну маленькага тэатра. Толькі тут усё адбывалася без рэпетыцый, з чыстага, як кажуць, аркуша паперы. І выправіць тую ці іншую «сцэнку» ўжо не ўяўлялася магчымым...

ЛЫЖЫ

ЦЯЛЕЦ. На гэтым тыдні дзелавыя сустрэчы і перамовы акажуцца эфектыўнымі, так што смела агучвайце свае ўмовы. Добры настрой будзе суправаджаць вас увесь тыдзень, а любыя праблемы здадуцца вырашальнымі. Толькі не варта мяняць планы і кідацца з крайнасці ў крайнасць. У чацвер можаце патрапіць у сітуацыю, якая ўжо адбывалася з вамі калісьці. Але назапашаны вопыт дазволіць не толькі бязбольна перажыць вяртанне да мінулага, але і атрымаць з яго шмат карысці.

БЛІЗНЯТЫ. У вас асабліва будуць атрымлівацца як цалкам новыя праекты, так і вяртанне да старых, няскончаных і даўно забытых спраў. Сканцэнтруйцеся на творчых ідэях, і яны прынясуць прыбытак, прычым такі, які значна павысіць якасць вашага жыцця. Магчыма, некаторых прадстаўнікоў знака чакае прыемная замежная паездка.

РАК. На гэтым тыдні лёс можа прыгатаваць для вас нечаканыя віражы, таму прадбачлівасць не перашкодзіць. У панядзелак і аўторак пажадана праявіць асцярожнасць і заняцца завяршэннем старых спраў. Астатні час будзе спрыяльны для новых творчых пачынанняў. З чацвярга перамовы і кантакты значна спросцяцца, што дазволіць у вольны час, які з'явіцца, заняцца чымсьці прыемным. У нядзелю чакайце рамантычнага сюрпрыза.

ЛЕЎ. Давядзецца паглыбіцца ў работу, і менавіта ад яе будуць залежаць вашы далейшыя поспехі. Самае важнае — пазбягаць непатрэбнай мітусні, а таксама залішняй актыўнасці. Добры час для адпачынку на моры або для замежнага падарожжа. Неабходна сур'ёзна заняцца хатнімі праблемамі, прысвяціць больш часу дзецям.

ДЗЕВА. Паспрабуйце на гэтым тыдні праяўляць больш цярпла і клопату. Калі вы шукаеце работу, то пошукі могуць завяршыцца поспехам. Не выключана, што станеце даверанай асобай кагосьці звычайна вельмі скрытнага. Пастаўцеся да яго шчырасці з павагай і не раскрывайце пачутае, нават калі вас пра гэта адмыслова не папросяць. І тады здабудзеце сябра. У сераду ёсць рызыка пасварыцца з блізкімі людзьмі.

ШАЛІ. Фартуна то хмурыцца, то хітра фліртуе з вамі, прапаноўваючы разнастайныя забавы і рамантычныя прыгоды. На гэтым тыдні чакаецца шмат цікавых сустрэч, званкоў, кантактаў як у асабістай сферы, так і ў дзелавой. У суботні дзень можна здзяйсняць самыя вар'яцкія і рызыкоўныя крокі, галоўнае — быць упэўненым у сваёй праваце і нікому не жадаць зла.

СКАРПІЁН. У панядзелак можа паступіць інфармацыя, якая станоўча паўплывае на вашу кар'еру. У аўторак будзеце поўныя сіл і энергіі, работа закіпіць. У чацвер у асабістым жыцці ўсё зменіцца да лепшага, гэты дзень можна назваць днём выканання жаданняў.

СТРАЛЕЦ. Панядзелак абяцае шмат сур'ёзных спраў, у вашых інтарэсах заняцца імі, не адкладваючы на потым. Не выключана, што давядзецца выслухаць чыесьці сакрэты: захавайце пачутае, ды і сам факт такой размовы ў тайне — вам будуць удзячныя. Аўторак і сераду пажадана выкарыстоўваць на выкананне ўласных планаў, адступленні ад вызначанага шляху непажаданыя. Увагі могуць запатрабаваць сямейныя і асабістыя справы.

КАЗЯРОГ. На гэтым тыдні варта выдаткаваць трохі часу, каб правільна сарыентавацца ў сітуацыі — і тады не давядзецца лезці ў акно, бо будзеце ведаць, дзе знаходзяцца дзверы. Узважвайце кожнае слова ў аўторак і не давайце нездзяйсняльных абяцанняў начальству і калегам. У сераду падкрэсленая карэктнасць і такт пазбавяць ад непатрэбных канфліктаў у калектыве і захаваюць душэўны спакой. У выхадныя лепш адпачыць з сям'ёй.

ВАДАЛІЙ. Спяшайцеся рэалізоўваць патаемныя мары, бо гэтыя дні адкрываюць перад вамі самыя бліскучыя перспектывы. Сустрэчы і новыя знаёмствы акажуцца плённымі, хоць і не адразу. На гэтым тыдні варта закласці падмурак для будучых перамен. У другой яго палове давядзецца даказваць начальству, што вы здольныя на многае. У незнаёмай абстаноўцы праяўляйце разумную стрыманасць, гэта дазволіць пазбегнуць праблем.

РЫБЫ. Тыдзень будзе спрыяльны для завяршэння назапашаных спраў. Праяўляйце ўласцівыя вам добрасумленнасць і пунктуальнасць, звярніце пільную ўвагу на дробязі і не давядзецца выпраўляць свае памылкі, іх проста не будзе. Паспрабуйце менш крытыкаваць калег па рабоце, памятайце, маўчанне — золата, яны і так усё зразумеюць. Не цягніце коўдру на сябе і не хваліцеся.

Даты Падзеі Людзі

21 ВЕРАСНЯ

У краіне

1903 год — нарадзіўся (вёска Лошыца, цяпер у межах Мінска) Іосіф Аляксандравіч Бельскі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, партыйны і прафсаюзны дзеяч Беларусі. Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 годзе. У перыяд акупацыі Беларусі нямецка-фашысцкімі захопнікамі з ліпеня 1941 года сакратар Мінскага падпольнага абкама КП(б)Б. Удзельнічаў у стварэнні 63 падпольных першасных партыйных арганізацый у Мінскай і Палескай абласцях, у разгроме варожых гарнізонаў і іншых баявых аперацыях. У 1948—1958 гадах — старшыня Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў. Памёр у 1966 годзе. Яго імем названа вуліца ў Мінску.

1918 год — нарадзіўся (вёска Клетнае Глускага раёна) Фёдар Міхайлавіч Янкоўскі, беларускі мовазнавец, пісьменнік, доктар філалагічных навык, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Заснавальнік беларускай фразеалогіі. Даследаваў фанетыку, лексіку, фразеалогію, граматыку беларускай народнай і літаратурнай мовы, яе гісторыю. Укладальнік зборнікаў крылатых слоў і афарызмаў. Пісаў навелы, апавяданні, літаратурныя мініяцюры. Памёр у 1989 годзе.

1923 год — нарадзіўся (пасёлак Лучны Мост Бярэзінскага раёна) Мікалай Аляксандравіч Барысевіч, фізік, акадэмік НАН Беларусі, АН СССР, РАН, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, замежны член Славенскай акадэміі навук і мастацтваў, замежны член Чэхаславацкай АН, правадзейны член Еўрапейскай акадэміі навук, мастацтваў і славеснасці, ганаровы доктар прыродазнаўчых навук Іенскага ўніверсітэта імя Ф. Шылера. На працягу 18 гадоў (з 1969-га да 1987 года) Мікалай Барысевіч узначальваў Акадэмію навук Беларусі. Аўтар больш як 300 навуковых прац, у тым ліку трох манаграфій. Праводзіў даследаванні па люмінесцэнцыі і спектраскапіі складаных малекул, лазернай фізіцы і інфрачырвонай тэхніцы. Ім распрацавана статыстычная тэорыя фотафізічных працэсаў у складаных малекулах. Лаўрэат Ленінскай прэміі, Дзяржаўнай прэміі СССР, Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 2015 годзе.

1958 год — нарадзіўся Алег Мікалаевіч Елісеенкаў, беларускі кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Працуе ў розных жанрах. Сярод твораў: сімфоніі «Дывертысмент» і «Камерная музыка» для струннага аркестра, «Варыяцыі» для цымбалаў, песні на словы беларускіх і іншых кампазітараў, музыка да драматычных спектакляў і кінафільмаў.

У свеце

1933 год — у Лейпцыгу пачаўся інсцэніраваны нацыстамі судовы працэс супраць камуністаў, абвінавачаных у падпале рэйхстага. Галоўным абвінавачаным на працэсе быў балгарскі камуніст Георгій Дзімітраў.

1947 год — нарадзілася Вольга Астравумава, расійская актрыса тэатра і кіно, артыстка Маскоўскага акадэмічнага тэатра імя Массавета, народная артыстка Расіі. Здымалася ў фільмах «Дажывём да панядзелка», «А досвіткі тут ціхія...», «Каханне зямное», «Лёс», «Гараж» і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.53	19.11	12.18
Віцебск —	6.42	19.01	12.19
Магілёў —	6.43	19.01	12.18
Гомель —	6.40	18.58	12.18
Гродна —	7.08	19.27	12.19
Брэст —	7.09	19.27	12.18

Месяц

Першая квадра 17 верасня.
Месяц у сузор'і Вадаліва.

Імяніны

Пр. *НАРАДЖЭННЕ НАЙСВЯЦЕЙШАЙ БАГАРОДЗІЦЫ, Марыі, Георгія.*
К. *Аляксандра, Іпаліта, Мацея.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Доктар, а якія бываюць прыкметы склерозу?
— Я ж учора вам казаў!

Жаночае...

Учора цэлую гадзіну муж слухаў мяне з раскрытым ротам.

Прыгледзелася — спіць, падлюга!

— Потым я доўга хадзіла да сямейнага псіхолага.
— А чаму перастала?
— Жонка псіхолага была супраць.

Аб'ява па радыё:

— Увага! У нашым гандлёвым цэнтры знойдзены хлопчык Алёша, 20 гадоў. Бацькоў просяць падысці ў бар і аплаціць два «Гінесы».

Жыццё — даволі несправядлівая штука. Ты можаш выпадкова камусьці зрабіць дзіця, але не можаш выпадкова зрабіць мільён долараў.

Выносіў смецце. Суседзі падумалі, што пераязджаю.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3447.

Нумар падпісаны ў 19.30 20 верасня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

21 верасня 2018 г. № 38 (471)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ТЭМА ТЫДНЯ

КОЛЬКАСЦЬ СУПРАЦЬ ЯКАСЦІ?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Чаму ў краіне варта аптымізаваць колькасць сельсаветаў і павышаць эфектыўнасць работы мясцовых органаў улады

З 11 да 12 верасня ў Беларусі знаходзілася дэлегацыя Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы. З удзелам прадстаўнікоў верхняй палаты беларускага парламента, экспертаў з Францыі, Італіі, Нідэрландаў, Грэцыі, Румыніі і Беларусі быў праведзены круглы стол па значных пытаннях мясцовага самакіравання. Найбольш актуальныя з іх датычыліся ўмоў далейшага развіцця сістэмы мясцовага самакіравання. На думку экспертаў, узрастанне ролі мясцовых органаў улады немагчыма без удасканалення сістэмы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення (АТД). Беларускія навукоўцы, у сваю чаргу, ужо сёння гатовы прапанаваць магчымыя варыянты.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на 4–13-й стар.

НА ПЕРСПЕКТЫВУ

ЗАЧАПІЦЬ МАЛАДЫХ

Да парламенцкай дзейнасці трэба прывучацца загадзя

У пачатку верасня Савет Рэспублікі наведалі прадстаўнікі маладзёжнага парламента Чавускага раённага Савета дэпутатаў. З маладымі людзьмі сустрэліся старшыня верхняй палаты Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ і старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір ПАНЦЮХОЎ. Такая высокая ўвага сведчыць пра значную ролю моладзі ў дзяржаўнай палітыцы. Мы распыталі члена Савета Рэспублікі ад Магілёўскай вобласці Уладзіміра Панцюхова пра чавускі маладзёжны парламент і чаканні ад яго дзейнасці.

— Уладзімір Іванавіч, што за людзі ўвайшлі ў маладзёжны парламент Чавускага раённага Савета дэпутатаў?

— Маладзёжныя парламенты з'явіліся ў нашай краіне, у тым ліку ў рэгіёнах, параўнальна нядаўна. Сёлета была створана Маладзёжная палата пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі. У Чавусах досыць актыўная моладзь, і гэтаму садзейнічае пазіцыя **старшыні раённага Савета дэпутатаў Анатоля МАЦЮЛІНА.** Ён сур'ёзна задумаўся аб тым, хто прыйдзе на змену цяперашнім дэпутатам. Не сакрэт, што сёння ў краіне назіраецца пэўны кадравы голад. Моладзь адрозніваецца ад той, што была раней. Але ёсць і актыўная, якая хацела б займацца грамадскімі справамі, — яе трэба падтрымаць. Закласці цаглінку ў яе будучыню і ў будучыню раёна, краіны ў цэлым.

стар. 3

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Як гэта працуе

Новы ўказ аб пустуючых дамах павінен змяніць сітуацыю на месцах. стар. 2

Тэхніка — нямецкая, веды — нашы

Будзем сябраваць... ліцэямі! стар. 3

Аптымізацыя працягваецца

Як горад «паглынае» вёскі. стар. 14

Даеш мабільнасць!

Ці можна вырашыць праблему заторaў у мегаполісе? стар. 15

Плюсы і мінусы



У Ляхавіцкім райвыканкаме падвялі вынікі паўгоддзя. стар. 16

КРАСНОАРМЕЙСКАЯ, 9

На пути к Целям

В столице прошла конференция по проектам государственно-частного партнерства

Зарубежный опыт и лучшие управленческие практики в реализации инфраструктурных проектов изучили участники международной конференции «Роль проектов ГЧП в достижении Целей устойчивого развития и повышения благосостояния людей». Мероприятие посетили заместитель председателя Совета Республики Национального собрания Марианна ЩЕТКИНА и председатель Постоянной комиссии Совета Республики по экономике, бюджету и финансам Владимир ПАНТЮХОВ.

Фота БелТА.

Одной из главных тем для диалога стало привлечение частных инвестиций для создания инфраструктуры стран — участниц инициативы «Один пояс, один путь». Кроме этого, на конференции рассмотрели развитие индустриального парка «Великий камень», а также опыт государственно-частного партнерства в регионах. Марианна Щеткина выступила с докладом на тему «Цели устойчивого развития в Республике Беларусь: основные задачи и показатели». Мероприятие было организовано Министерством экономики совместно с Национальным агентством инвестиций и приватизации, Европейской экономической комиссией ООН, Всемирным банком и Беларусбанком.

Работаем над законом

Парламентарии обсудили правовое поле Союзного государства

Традиционно члены Парламентского собрания Союза Беларуси и России посетили Ростов-на-Дону. Там прошел ежегодный фестиваль «Молодежь — за Союзное государство», а депутаты и сенаторы обсудили повестку дня.

Так, в заседании Комиссии Парламентского собрания Союза Беларуси и России (ПС) по законодательству и регламенту приняла участие **председатель Постоянной комиссии Совета Республики по законодательству и государственному строительству, заместитель председателя Комиссии ПС Алла БОДАК.** Участники обсудили анализ положений Договора о создании Союзного государства, а также проект Концепции сближения законодательства Беларуси и России. Алла Бодак акцентировала внимание на необходимости выработать меры, которые не только устраняли бы имеющиеся расхождения в законодательстве двух стран, но и предупреждали бы появление новых. Кроме того, необходимо увязать процессы сближения законодательства Беларуси и России с формированием права Евразийского экономического союза.

Проверим на практике

Сенаторы выехали в регион, чтобы рассмотреть работу закона

В начале недели в Гродно состоялось расширенное выездное заседание Постоянной комиссии Совета Республики по законодательству и государственному строительству, где рассмотрели практику применения Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве». На месте были подведены итоги мониторинга работы этого документа за 2018 год.

Председатель Постоянной комиссии Совета Республики по законодательству и государственному строительству Алла БОДАК подчеркнула, что необходимо и дальше совершенствовать институт исполнительного производства. Выступающие говорили о проблемных местах, возникающих при исполнении документов. Также участники рассмотрели опыт судов по этому вопросу, прокуратуры и финансовых органов. Посещая «Молочный Мир», сенаторы также обратили внимание на некоторые аспекты взыскания задолженностей субъектами хозяйствования.

Надежда АНИСОВИЧ.

ЯК ГЭТА ПРАЦУЕ?

НІЧЫЙНЫХ ДАМОЎ НЕ БУДЗЕ. ЗУСІМ

Паводле новага ўказа, мясцовыя ўлады павінны навесці парадак з усёй нерухомасцю максімум за год

Прэзідэнт у пачатку верасня падпісаў Указ № 357 «Аб пустуючых і старых дамах». Раней дзеючы Указ № 100 аб пустых дамах, прыняты шэсць гадоў таму, адыграў сваю ролю, адзначыў старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Андрэй ГАЕЎ. За час дзеяння гэтага ўказа было выяўлена і ўнесена ў рэгістры ўліку 14 тысяч пустуючых дамоў, а таксама каля 39 тысяч старых, на знос пайшло 48 тысяч старых і пустуючых будынкаў. У апошнія гады эксперты вырашылі прааналізаваць практыку прымянення 100-га ўказа. Было вырашана падкарэктаваць гэты дакумент і нават дзесьці яго спрасціць.

АДЗІН ДЗЕНЬ ЗА ТРЫ ГАДЫ

Дзеянне новага ўказа распаўсюджана не толькі на сельскую мясцовасць, а ў цэлым на ўсю краіну. Бо гэта праблема датычыцца і нерухомасці ў сярэдніх і нават буйных гарадах. Цяпер у нас **устаноўлены адзіныя ўніверсальныя правілы работы з трухлявымі і пустуючымі дамамі.**

Спрошчаны і падыход да вызначэння тых аб'ектаў, якія называюцца пустуючымі дамамі. Раней для гэтага трэба было, каб на працягу трох гадоў чалавек жыў у гэтым доме менш за месяц. Па новым указе гэты тэрмін чыста сімвалічны — менш аднаго дня на працягу трох гадоў. Па сутнасці, гаворка ідзе пра тое, каб дом быў у прыдатным стане, а ўчастак вакол дома — добраўпарадкаваны. Тады яго не ўнясуць у рэестр. Ніхто не будзе лічыць, колькі дзён гаспадар пражыў у сваім жыллі. Галоўнае, каб парадак быў у хаце і вакол яе.

ПОШУК «ДРЭННЫХ» ДАМОЎ

Пустуючым стане той дом, у якім на працягу трох гадоў гаспадары не пражывалі ні дня і да таго ж не падалі ў мясцовы выканкам (сельсавет) паведамленне аб намеры выкарыстоўваць яго для пражывання. Старымі запішуць тыя будынкі (аварыйныя і якія пагражаюць абвалам), дзе не жывуць і не прымаюць меры па аднаўленні альбо зносе на працягу аднаго года.

Каб прызнаць дом пустуючым або старым, яго павінна наведаць камісія (чыноўнікі і міліцыя) і на месцы высветліць, што дом незаселены. Камісіі павінны займацца пошукамі нічыйных дамоў два разы на год.

ШТО З ПУСТЫМ ДОМАМ?

Калі ёсць гаспадар, то яму дашлюць апавяшчэнне, што дом хочуць прызнаць пустуючым. Калі гэты чалавек на працягу месяца не дашле ў адказ апавяшчэнне аб тым, што будзе яго выкарыстоўваць для пражывання, альбо калі ён адмовіцца ад дома, альбо не будзе знойдзены, звесткі аб пустым доме апублікуюць у СМІ і на сайтах райвыканкамаў або адміністрацый раёнаў.

Дарэчы, спадчыннікі могуць і не мець на руках дакументаў, якія даюць права на дом. Пра гэта яны таксама павінны паведаміць мясцовым уладам. Калі ўладальнік дома праходзіць службу або вучыцца за межамі населенага пункта, ён павінен паведаміць у выканкам — тады на працягу трох гадоў яго домам ніхто цікавіцца не будзе.

Пасля таго як звесткі пра дом правіселі на сайце мясцовага выканкама месяц, а ўладальнікі так і не аб'явіліся, дом на працягу 15 дзён павінен быць уключаны камісіяй у рэестр пустых дамоў. І не менш чым праз два месяцы звесткі пра яго павінны паступіць у суд, які прызнае дом і ўчастак уласнасцю райвыканкама. Пасля суда ў выканкама будзе 30 дзён на тое, каб вызначыцца: дом будзе знесены або прададзены.

РЫНКАВУЮ ЦАНУ МОЖНА ЗНІЗІЦЬ

Указам спрошчаны і парадак продажу старых і пустуючых дамоў. Без правядзення аўкцыёнаў прадугледжваецца іх продаж ва ўсіх населеных пунктах, за выключэннем Мінска і абласных цэнтраў. Разам з тым абласным выканкамам дадзена права з улікам інтарэсаў

дзяржавы і мясцовых умоў вызначаць і іншыя тэрыторыі, дзе аб'екты будуць прадавацца толькі на падставе таргоў, гэта значыць там, дзе існуе павышаны попыт на аб'екты і зямельныя ўчасткі. (Напэўна, у такі спіс уключаць населеныя пункты каля Мінска.)

«Продаж будзе ажыццяўляцца па рынкавай цане, калі аб'ект рэалізуецца напрамую. Калі прадаецца на таргах, то рынкавая цана стане стартавай, — растлумачыў Андрэй Гаеў. — У параўнанні з агульным прававым рэгуляваннем ацэначнай дзейнасці ўстаноўлены больш доўгі тэрмін дзеяння справаздачы аб ацэнцы. Вынік праведзенай незалежнай ацэнкі ў дачыненні да гэтых аб'ектаў будзе дзейнічаць два гады».

Пры безвыніковасці таргоў указам прадугледжана паэтапнае зніжэнне цаны продажу старых і пакінутых дамоў на 20 %, 50 % і 80 %. Грошы, атрыманыя ад продажу пакінутых дамоў, пойдуць у бюджэт той вёскі ці горада, дзе ён размешчаны. А яшчэ ва ўказе прапісана: землі, на якіх знаходзіцца пусты дом, што падлягае зносу, могуць быць перададзены новаму землекарыстальніку пры ўмове, што той ажыццявіць знос за свой кошт альбо аплаціць гэты знос.

Старшыня Дзяржкаммаёмасці звярнуў увагу, што дзеянне ўказа не распаўсюджваецца на тэрыторыі садаводчых таварыстваў — там будзе дзейнічаць агульнае заканадаўства.

РЭАЛЬНЫЯ ЎЛАСНІКІ АБАРОНЕНЫ

Дарэчы, ва Указе № 357 асобна прапісана: калі рашэнне суда аб прызнанні дома пустуючым будзе адменена, былы ўласнік можа вярнуць сабе дом толькі ў выпадку, калі ён перайшоў да мясцовага выканкама. Калі ж дом быў прададзены, чалавек зможа разлічваць на суму, за якую той прадалі, калі знесены — на кампенсацыю ў суме, у якую дом быў ацэнены перад зносам.

СПАДЧЫННІКА НЯМА — ГАСПАДАР ЁСЦЬ

Дзеянне ўказа будзе распаўсюджвацца ў тым ліку на аб'екты, якія рашэннямі судоў прызнаны вымарачнай спадчынай. Маёмасць з'яўляецца вымарачнай спадчынай, калі ад яе адмовіліся спадчыннікі альбо калі іх няма наогул. Ёсць агульнае правіла, па якім спадчыннікі, якія жадаюць уступіць у спадчыну, на працягу шасці месяцаў са дня смерці спадчынадаўцы павінны заявіць пра свае правы. Калі гэтага ніхто не зрабіў, то па заканчэнні года выканкам звяртаецца ў суд дзеля прызнання права камунальнай уласнасці на маёмасць. Гэта можа быць у тым ліку жылы дом, зямельны ўчастак. У нашай краіне за апошнія пяць гадоў суды задаволілі каля 1,2 тысячы заяў па прызнанні спадчыны вымарачнай.

Сяргей КУРКАЧ.

ХУТЧЭЙ НАВЕСЦІ ПАРАДАК

Асноўная мэта Указа № 357 — паскорыць працэдуру канфіскацыі пустуючага і старога жылля. Раней працэдура магла расцягвацца на доўгія гады. Часта мясцовыя ўлады шкадавалі людзей і дзесяцігоддзямі не чапалі былыя родавыя маёнткі, на якія ў спадчыннікаў няма ні часу, ні сіл. Зараз ёсць указ, дзе дакладна ўсё прапісана. Камісія выявіла пусты дом, знайшла ўладальніка, растлумачыла яму яго правы і абавязкі. І калі ў гаспадара няма рэакцыі — суд, знос або продаж. Усё павінна змясціцца максімум у год.

ЗАЧАПІЦЬ МАЛАДЫХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Менавіта такія маладыя людзі былі ў складзе дэлегацыі маладзёжнага парламента з Чавус. Гэта ўжо, дарэчы, другі візіт. Першы адбыўся прыкладна год таму. Трэба сказаць, што колькасць маладых парламентарыяў расце. А школа дэпутацтва — гэта школа жыцця, я ў гэтым цвёрда ўпэўнены. Такая школа пройдзена мной, і яна дапамагла мне сфарміравацца як асобе і палітыку.

— Вы сказалі, што ў Чавусах актыўная моладзь. Гэта абумоўлена яшчэ і нейкай асаблівасцю рэгіёна?

— Чавусы знаходзяцца блізка ад Магілёва. І гэта значыць, што калі моладзь не зацікавіць, яна з'едзе ў абласны цэнтр. Калі ў Чавусах будзе цікава жыць і працаваць, моладзь застанецца. Для гэтага там узводзяцца спартыўныя збудаванні, праводзяцца грамадскія мерапрыемствы, у тым ліку ў сельсаветах. Нездарма спартсмены родам з Чавус гучна заяўляюць пра сябе ў цяжкай атлетыцы, біятлоне. Алімпійская чэмпіёнка 2018 года Дзінара Алімбекава пачынала займацца лыжным спортам у Спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школе алімпійскага рэзерву Чавускага раёна, і цяпер не забывае яе. З гэтай жа ўстановы выйшлі сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў 2010 года Сяргей Новікаў, чэмпіён Еўропы сярод юніёраў 2014 года Раман Елятноў, іншыя выдатныя спартсмены. Чавускія выхаванцы і цяпер у лідарах на абласных спаборніцтвах.

Мне прыемна казаць пра гэты рэгіён, бо для мяне ён стаў другой малой радзімай. Я вырас на Чачэршчыне, у мясцінах, якія апынуліся ў зоне адсялення пасля аварыі на ЧАЭС, зараз там ніхто не жыве. А Чавусам аддаў амаль 9 гадоў свайго дэпутацкага служэння. Мае намаганні ўшанаваныя званнем «Ганаровы грамадзянін Чавускага раёна». Дарэчы, такіх людзей усяго пяць. Таму я заўсёды пра Чавускі раён памятаю і імкнуся нешта зрабіць для яго.

— Ці можна сказаць, што чавуская спартыўная школа ў шырокім сэнсе стала адметнай рысай рэгіёна?

— Увогуле ў раёне некалькі выдатных спартыўных установ. У Чавусах пасля вайны быў арганізаваны дзіцячы дом, потым ён стаў школай-інтэрнатам для дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. У свой час было прынятае правільнае рашэнне — уцягнуць такіх дзяцей у спорт. Поспехі ў гэтым кірунку прывялі да змены статусу школы — яна стала абласной. Цяпер туды едуць займацца дзеці з усёй краіны.

У Чавусах будуецца добрая лыжароллерная траса, да з'яўлення якой я, разам з іншымі, прыклаў шмат намаганняў. Гэта значыць, што яшчэ больш людзей знойдуць у рэгіёне для сябе нешта цікавае.

Сур'ёзны фундамент для ўсяго гэтага ў свой час заклаў Барыс Батура, колішні кіраўнік вобласці. З таго часу і на працягу гадоў пятнаццаці туды ездзім рэгулярна і я, і цяперашняе кіраўніцтва вобласці, прадстаўнікі «Магілёўхімвалакна», іншыя папячыцелі.

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ падчас размовы з дэлегацыяй маладзёжнага парламента Чавускага раённага Савета дэпутатаў заклікаў маладых людзей быць актыўнымі ў вырашэнні важных для грамадства і краіны пытанняў, выказваць свае ідэі і прапановы. Удзел у такім парламенце — гэта магчымасць праявіць свае лідарскія якасці, навучыцца працаваць у камандзе, вылучаць ідэі і адстойваць свой пункт гледжання, падкрэсліў кіраўнік верхняй палаты.

Міхаіл Мясніковіч расказаў таксама пра работу над новай рэдакцыяй Кодэкса аб адукацыі. Савет Рэспублікі накіраваў у Савет Міністраў прапановы, якія датычацца забеспячэння ўзаемасувязі выхавання і навучання ў адукацыйным працэсе, развіцця сучаснага інфармацыйнага асяроддзя і сістэмы падтрымкі таленавітай моладзі, падрыхтоўкі кадраў для інавацыйных, экспартна арыентаваных прадпрыемстваў з улікам узмацнення практычнай накіраванасці навучання.

Яшчэ адной тэмай размовы стала падрыхтоўка да V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які пройдзе сёлета ў Магілёве 10—12 кастрычніка.

Маладзёжны парламент дазволіць больш шырокаму колу актыўных маладых людзей знайсці сферу прыкладання сваіх талентаў. З іншага боку, нам вельмі важна бачыць, што нехта прыйдзе пасля нас, і што той, хто прыйдзе, будзе здольны абараняць інтарэсы жыхароў рэгіёна, садзейнічаць яго развіццю.

— Наколькі гэта патрэбна самой моладзі?

— Калі раённы Савет дэпутатаў узначальвае такі чалавек, як Анатоль Мацюлін, тады і моладзь у парламент падбіраецца невыпадковая і ёсць шанц зрабіць крок наперад, задзел для дня заўтрашняга. Мы ў Савеце Рэспублікі бачылі, як яны слухалі, як гарэлі іх вочы, як ім было цікава.

Увогуле, у чавускі парламент увайшлі і настаўнікі, і сацыяльныя работнікі, і механізатары, і школьнікі...

— Моладзі шмат увагі будзе ўдзяляцца і на V Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

— І ўвага гэта не зменшыцца ў будучым. Улада павінна думаць пра маладое пакаленне. Бачыце, колькі маладых людзей з'язджае ў іншыя краіны на вучобу, колькі застаецца там жыць, колькі едзе за мяжу працаваць. Дабаўце да гэтага дэмаграфічныя пытанні...

Мы ў справе з маладзёжным парламентам пакуль на пачатку шляху. Тут патрэбна ідэя, якая ўдыхнула б энергію ў гэту структуру, напоўніла яе жывым рухам. Нам, парламентарыям, трэба больш адкрыцца для моладзі. Мы павінны выразна запрасіць маладых актывістаў да ўдзелу ў кіраванні краінай. Тэм у заканатворчасці для гэтага дастаткова: тая ж лічбавая эканоміка, дзяржаўна-прыватнае партнёрства, малы бізнес, адукацыя, жыллё, працаўладкаванне...

Для разумнага маладога чалавека сфер, дзе ён можа сябе праявіць, хопіць. Наша задача — дапамагчы. Мы не павінны шкадаваць для гэтага свой час.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

У тэму

Старшыня Чавускага раённага Савета дэпутатаў Анатоль МАЦЮЛІН:

— Новы склад нашага маладзёжнага парламента абраўся сёлета ў маі, пасля выбараў у мясцовыя Саветы. Туды ўвайшлі прадстаўнікі чатырох буйных школ, працоўных калектываў горада і аграгарадкоў. Усяго 30 чалавек. Усе яны члены БРСМ, але не абавязкова старшыні пярвічак. Сярод іх ёсць і дзеючыя дэпутаты. Дарэчы, першы маладзёжны парламент мы абралі ў апошні год мінулага склікання мясцовых Саветаў. Тады мэта была падняць актыўнасць моладзі, і гэта нам удалося. Калі ў 27-м скліканні ў Чавускім рэгіёне было толькі тры маладыя дэпутаты, то цяпер — 29.

Мы сёння знаходзімся ў працэсе асэнсавання месца і ролі маладзёжнага парламента ў развіцці грамадства. Мы хочам, каб гэтыя маладыя людзі выносілі на ўзровень мясцовага кіравання пытанні, актуальныя ў іх працоўных калектывах. На пятым Усебеларускім народным сходзе адным з прыярытэтаў развіцця краіны была названа моладзь. Таму мы яе ўцягваем у дэпутацкі корпус.

Мы разглядаем маладзёжны парламент як орган самакіравання. Уручаем яго членам пасведчанні, як і старастам, членам таварыстваў шматкватэрных дамоў, вулічных камітэтаў. Гэта ўжо вылучае чалавека і падымае яго адказнасць перад равеснікамі і калегамі. А праблем у працоўных калектывах дастаткова. Трэба не толькі іх умець убачыць, але і прапанаваць шляхі вырашэння. Праз гэта мы заўважаем перспектыўных у плане кадравага рэзерву маладых людзей.

А візіт у Савет Рэспублікі паказаў маладым людзям, наколькі яны цікавыя для краіны.

МЕЖДУНАРОДНОЕ СОТРУДНИЧЕСТВО

Техника — немецкая, а знания — наши

Этим летом делегация учащихся и педагогов Минского государственного профессионального лицея № 12 строительства посетила немецкий город Вердау. На протяжении десяти дней шестнадцать студентов знакомились с работой крупных предприятий (к примеру, концерна «Фольксваген») и старательно учились (занятия были на немецком языке, с техническими тонкостями помогали справляться переводчики). Конечно, не обошлось и без обширной культурной программы — ребята посетили местный парламент, музей импрессионизма, автомобилей, но главной задачей этой поездки все же была учеба.

В здании парламента Саксонии.

Директор лицея № 12 Степан ШЕЛЕГ в беседе с нашим корреспондентом подчеркнул: поездке и последующему заключению Договора о намерениях долгосрочного сотрудничества между учреждениями профессионального образования Вердау и лицеем № 12 предшествовала длительная работа с парламентом земли Саксония. «Член парламента земли Саксония Ян Лефлер приезжал сюда неоднократно, как и другие представители местного парламента», — рассказал директор лицея.

По его словам, во время нескольких встреч с Яном Лефлером на территории нашей страны был составлен план будущего сотрудничества, одним из пунктов которого и стало посещение Германии белорусской делегацией. Далее парламент вышел на Министерство иностранных дел Германии, которое выделило средства на встречи делегаций. Таким образом, заключенный Договор — это результат не только поездки, но и целого ряда встреч накануне.

О чем говорится в документе? Например, о посещении отечественными педагогами Германии. «Там готовы встречать для обмена опытом педагогов — не только нашего учебного заведения, но и других партнеров, кто может подключиться к сотрудничеству, — добавил Степан Шелег. — Возможен и обмен учащимися, чтобы немецкие ребята побывали у нас, посмотрели процесс обучения, а наши — изучили особенности работы зарубежных коллег. Это проект, который не затрагивает никаких политических целей, только обмен опытом и культурой».

Кстати, данная инициатива получила поддержку Совета Республики Национального собрания Беларуси. Так, председатель Совета Республики Михаил Мясникович встречался с делегацией парламента Саксонии. Тогда было отмечено, что подобное сотрудничество между двумя системами образования — нужное и важное дело.

В конце сентября текущего года член местного парламента Ян Лефлер вновь прибудет в Беларусь, чтобы более конкретно обсудить направления взаимодействия, добавил Степан Шелег.

Заместитель директора по учебно-воспитательной работе лицея Ирина БЕЛОУС подчеркнула, что такой обмен опытом полезен и для немецкой стороны. По ее словам, в Беларуси сохранили классическую советскую систему обучения, где постепенно, ступень за ступенью, готовят разносторонних специалистов, тогда как в Германии существует четкий заказ кадров коммерческой организацией по конкретной узкой специализации.

В свою очередь, нашим учащимся показали самое современное оборудование. Под некоторое ребята учились писать программы, на ином пробовали работать вручную. «Если выпускники придут на заводы, где есть такая техника, не нужно будет к ним прикреплять мастеров: они уже смогут работать сами», — отметила Ирина Белоус.

Кстати, помимо технической оснащенности предприятий, учащиеся были поражены тем, как в Германии относятся к охране труда и поддержанию здорового образа жизни сотрудников, добавила заместитель директора.

Владислав ЛУКАШЕВИЧ.

Сем разоў адмераць...

З аднаго боку, працэс аптымізацыі сельсаветаў непазбежны, бо на вёсцы імкліва памяншаецца колькасць людзей.
З другога — яго трэба праводзіць вельмі акуратна, каб пазбегнуць закрыцця аб'ектаў сацыяльнай сферы, што ўрэшце прывядзе і да скарачэння рабочых месцаў, і да адтоку працоўнай сілы.

Так лічыць **Рыгор ЯКУШАЎ, старшыня Рэчыцкага раённага Савета дэпутатаў,** які да гэтага часу доўга працаваў начальнікам аддзела арганізацыйна-кадравай работы ў Рэчыцкім райвыканкаме. Дарэчы, яму даводзілася прымаць удзел у падобных аптымізацыях. Таму Якушаў добра ведае, як балюча часам яны адбіваюцца на людзях, што жывуць у аддаленых населеных пунктах:

— На маёй памяці ў Рэчыцкім раёне два разы праводзілі аптымізацыю сельсаветаў. Канешне, калі ў сельсавеце толькі 10 населеных пунктаў, ім лягчэй кіраваць. А калі аб'ядналі два сельсаветы і атрымалася 25—30 населеных пунктаў — кіраваць вельмі складана. Складана нават бываць у кожнай вёсцы такога вялікага па тэрыторыі сельсавета. Сёння ў нашым раёне — адзін гарадскі, адзін пасялковы і 17 сельсаветаў. Два з іх маюць колькасць насельніцтва больш за 500 чалавек. Працэс аптымізацыі сельсаветаў трэба праводзіць там, дзе колькасць вясковага насельніцтва складае менш за 500 чалавек. Але ж да гэтага трэба падыходзіць адказна. Важна ўлічваць асаблівасці кожнай канкрэтнай тэрыторыі і яе далейшага сацыяльна-эканамічнага развіцця. Трэба абавязкова прыслухоўвацца да думкі мясцовых жыхароў і разважаць пра тое, якім чынам будзе забяспечвацца насельніцтва ўсім самым неабходным. Напрыклад, улічваць рух аўтамабільнага і чыгуначнага транспарту: каб людзі маглі без праблем дабрацца да сельскага Савета — трэба ж афармляць і атрымліваць неабходныя дакументы. Пасля аптымізацыі тэрыторый важна не дапускаць закрыцця аб'ектаў сацыяльнай сферы, што часта прыводзіць да скарачэння рабочых месцаў. А гэта ў сваю чаргу вядзе да сітуацыі, калі працаздольнае насельніцтва ад'язджае з дробных населеных пунктаў. На вёсцы застаюцца толькі тыя, хто выйшаў на пенсію. Яны патрабуюць асаблівай увагі з боку мясцовых органаў улады. Пры аптымізацыі сельсаветаў таксама неабходна дадаткова ўводзіць новую адзінку — сельвыканкам— бо нагрузка на яго значная, а колькасць людзей зусім невялікая.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

КОЛЬКАСЦЬ СУПРАЦЬ

МЯККА ЦІ РАДЫКАЛЬНА?

Навукоўцы мяркуюць, што беларуская сістэма АТД не з'яўляецца аптымальнай. Гэта відаць хоць бы па тым, што сёння існуюць істотныя адрозненні рэгіёнаў аднаго рангу па колькасці насельніцтва, узроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця і забяспечанасці інфраструктурай.

— Такая сітуацыя прывяла да таго, што існуючае адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне не супадае з актуальнымі тэрытарыяльнымі сацыяльна-эканамічнымі супольнасцямі, якія адлюстроўваюць працэс раёнастварэння. Таму ў некаторых выпадках складана дамагчыся комплекснага развіцця тэрыторыі. Гаворка ідзе аб узаемным эканамічным, сацыяльным, дэмаграфічным, экалагічным і інавацыйным развіцці раёнаў, — лічыць **кандыдат эканамічных навук, загадчык аддзела сусветнай эканомікі і знешнеэканамічных даследаванняў Інстытута эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук Таццяна ВЯРЦІНСКАЯ.**

Сёння раёны краіны адрозніваюцца і па памерах, і па транспартнай даступнасці да раённых цэнтраў. Так, чатыры з шасці абласных цэнтраў знаходзяцца на адлегласці больш за 200 км ад цэнтра краіны, а 16 раённых цэнтраў размешчаны бліжэй да Мінска, чым да цэнтраў сваёй вобласці.

> Занадта вялікая аддаленасць асобных раёнаў ад абласной адміністрацыі аказвае негатыўны ўплыў на эфектыўнасць рашэння шэрагу мясцовых задач. У асобных раёнах і асабліва ў сельсаветах склалася цяжкая дэмаграфічная сітуацыя: міграцыйнае змяншэнне, перавышэнне смяротнасці над нараджальнасцю.

— Гэта прывяло да апусцення вёсак і пасёлкаў. Паралельна з дэпапуляцыяй і старэннем насельніцтва праблемай застаецца той факт, што большасць першасных адзінак адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення не мае дастатковых фінансавых і кадравых рэсурсаў для забеспячэння неабходнага мінімуму дзяржаўных паслуг, — адзначыла Таццяна Вярцінская.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

На яе думку, каб вырашыць вострыя сацыяльна-эканамічныя праблемы такога характару, у Беларусі неабходна арыентавацца на так званы мяккі варыянт удасканалення сістэмы АТД, згодна з якім трэба аб'ядноўваць сельсаветы тых населеных пунктаў, колькасць людзей у якіх скарачаецца. Такім чынам будзе павышацца эфектыўнасць работы мясцовых органаў улады.

Паводле ацэнак навукоўцаў, у аснове далейшага ўдасканалення АТД краіны павінна знаходзіцца ў тым ліку і забеспячэнне набліжанасці органаў мясцовага кіравання і самакіравання да насельніцтва — гэта дазволіць грамадзянам больш шырока ўдзельнічаць у вырашэнні мясцовых праблем і якасна аказваць сацыяльныя паслугі насельніцтву. Акрамя таго, важная і аптымізацыя колькасці дзяржаўных служачых і скарачэнне выдаткаў на іх утрыманне без шкоды для дзяржаўнага тэрытарыяльнага кіравання і нацыянальнай бяспекі.

— Зараз не назапашана крытычнай масы праблем і недахопаў існуючага АТД, таму радыкальных падыходаў да змены сеткі не патра-

УЛАСНЫ ДОСВЕД

ПРАЦЭС

Былы Ружанскі раён увайшоў у новую адміністрацыйную адзінку ў выніку аптымізацыі тэрыторый. Што з гэтага атрымалася?

РУЖАНСКІ пасялковы Савет быў узбуйнены 1 студзеня 2010 года. Тады ў яго склад увайшлі Варанілавіцкі і Ружанскі сельсаветы. Паўлаўскі сельсавет быў далучаны да Варанілавіцкага крыху раней. Такім чынам у складзе Ружанскага пассавета аказалася фактычна ўся тэрыторыя колішняга Ружанскага раёна, які існаваў у БССР з 1940 да 1962 года. Тады ў склад раёна ўваходзілі 13 сельсаветаў. Але ўзбуйненне ўжо праводзілася пачынаючы з 50-х. А ў 1954 годзе Ружанскі раён нават перадаваўся Гродзенскай вобласці, потым яго вярнулі назад, у Брэсцкую. Так што адміністрацыйныя перабудовы тут — не навіна. Старажылы памятаюць.

Санаторый «Ружанскі» .

У лютым 2010 года «МС» ужо расказвала, як ішла арганізацыйная работа па апошняй аптымізацыі. Тагачасны старшыня Пружанскага раённага Савета дэпутатаў Віктар Макарэвіч так выказаўся пра ўзбуйненне: «Адна з прычын звязана з аб'яднаннем чатырох сельгаспрадпрыемстваў у адно — «Ружаны-агра». Другая — прадыктавана працэсам устойлівага памяншэння колькасці насельніцтва ў вёсках».

І названы працэс, на жаль, працягваецца. Калі на момант аб'яднання (восем гадоў таму) насельніцтва новага пассавета складала 6482 чалавекі, то цяпер у 32 населеных пунктах пражывае 5695 чалавек. Прытым што колькасць насельніцтва ў гарадскім пасёлку Ружаны нават крышку ўзрасла. Тэрыторыя пассавета супараўнальная з памерамі невялікага раёна: з аднаго канца ў другі — больш за 30 кіламетраў. У штаце выканкама — шэсць чалавек (дарэчы, на момант аб'яднання іх было дзевяць).

Старшыня Ружанскага пассавета Аксана МАНЧЫК працуе на сваёй пасадзе з сакавіка гэтага года. Аксана Уладзіміраўна расказвае, што механізм сувязі з насельніцтвам вёсак адпрацаваны, у гэтай справе істотна дапамагаюць старасты і дэпутаты.

— У кожным населеным пункце не менш чым раз на год праходзяць сельскія сходы. Арганізоўваць іх дапамагае райаддзел па надзвычайных сітуацыях. Але на сходах мы разглядаем не толькі пытанні бяспекі пражывання, а абмяркоўваем усе надзённыя праблемы: дарогі, гандлёвае абслугоўванне, сацыяльныя паслугі... Адказваем на пытанні, бяром на заметку просьбы і заўвагі. Але ж сходы бываюць не часта. Таму нядаўна падрыхтавалі вялікія інфармацыйныя стэнды для размяшчэння ў шасці буйных вёсках. Там будзе вывешвацца любая надзённая інфармацыя супрацоўнікамі РАУС, МНС, а таксама звесткі, што датычацца работы медыцынскіх устаноў, пошты, гандлю. А калі інфармацыя аператыўная — скажам, пра адключэнне святла, вады, аварыі ці непаладкі ў інжынерных сетках — людзей апавяшчаюць старасты.

Паколькі наш пассавет адзін з самых аддаленых ад райцэнтра, людзям бывае не зусім зручна туды дабірацца, — працягвае Аксана Манчык. — Ад асобных вёсак да Пружан больш за 50 кіламетраў. У пасялковым Савеце існуе графік прыёму спецыялістамі з раёна. Землеўпарадчык прымае грамадзян па серадах два разы на месяц, ёсць прыёмныя дні ў натарыуса, супрацоўніка агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры. Грамадзяне, як правіла, запісваюцца загадзя ў кіраўніка спраў. Прыходзяць з падрыхтаванымі дакументамі, напрыклад, калі справа датычыцца выдзялення ўчастка зямлі для вядзення падсобнай гаспадаркі ці іншых патрэб. Гэтае пытанне можна вырашыць у Ружанах, няма патрэбы ехаць у райцэнтр, — кажа старшыня.

> “ Калі на момант аб'яднання (восем гадоў таму) насельніцтва новага пассавета складала 6482 чалавекі, то цяпер у 32 населеных пунктах пражывае 5695.

Гаворыць «Цэнтр»!

У новым сезоне Агульнанацыянальнае тэлебачанне прадставіла радыё «Цэнтр FM».

Пачуць яго ўжо можна ў Мінску на частаце 101,7 FM, Віцебску (93,3 FM), Гродне (90,4 FM), Полацку і Наваполацку (107,0 FM).

«Пры стварэнні новай радыёстанцыі, — адзначае яе дырэктар Аляксандр Сярэбранікаў, — былі выкарыстаны і тэхналогіі, якія ўжо зарэкамендавалі сябе, і наватарскія ідэі. Напрыклад, большасць рубрык у ранішнім і вячэрнім эфіры — аўтарскія, з цікавым, «незаездженым» падыходам». Так, разынкай ранішняй праграмы стане двухмоўны рускабеларускі эфір, а вядучыя вячэрняга шоу «Лайфхакеры» Жэня Задора і Антон Жданаў абяцаюць зацікавіць аўдыторыю не пераказам дарожнай абстаноўкі, а зусім іншымі тэмамі. А разбаўляць актуальныя навіны, якія збіраюцца ў рэжыме «тут і цяпер», вядучыя абяцаюць энергічнай, але не агрэсіўнай сучаснай поп-музыкай. Акрамя таго, у найбліжэйшы час радыё «Цэнтр FM» можна будзе не толькі пачуць, але і ўбачыць у рэжыме анлайн на сайце www.centerfm.by.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 52

Наступная задача Рыгора Атаянца ***(гл. дыяграму)*** атрымала першы пахвальны водгук у юбілейным конкурсе Віктара Зайцава.

Белыя: Крb5, Фh8, Лe1, Cd2, Ch1, пп. b2, c2, c5, e4, e5, f5 (11).

Чорныя: Крd4, пп. b4, d5, e6, f3 (5).

Мат у 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Кірыл Ступак выйграў Мемарыял В. Карчнога ў Пецярбургу (268 удзельнікаў). Аляксей Аляксандраў быў тут трэці, а Аляксей Фёдараў — адзінаццаты. Вось адна з партый апошняга тура.

Аляксей Аляксандраў — Дзяніс Першын. 1. c4 c6 2. Kc3 d5 3. e3 Kf6 4. Kf3 e6 5. b3 Kbd7 6. Cb2 Cd6 7. Фc2 0-0 8. h3 Фe7 9. g4 h6 10. g5 hg 11. K:g5 Ca3 12. C:a3 Ф:a3 13. Лg1 Фd6 14. d4 b6 15. f4 Cb7 16. Cd3 c5 17. Фg2 Ke8 18. Ch7+ Крh8 19. Фg4 cd 20. ed Cc6 21. Фh4 Kdf6 22. Лd1 Лc8 23. Крf2 Фe7 24. Лg3 Фd6 25. Ke2 Лc7 26. Лdg1 Фd8 27. Крf1 Фd6 28. Cb1+ Крg8 29. Kh7 Ke4 30. Л:g7+ K:g7 31. Kf6+, 1:0.

* * *

На юнацкім чэмпіянаце Еўропы ў Рызе Каця Зубкоўская заваявала «золата» ў групе да 8 гадоў, Вольга Бадэлька — «серабро» да 16, Аляксандра Тарасенка — «бронзу» да 12, Арцём Бяляўскі і Вячаслаў Зарубіцкі — «бронзу» адпаведна да 10 і да 16 гадоў. Сёмыя месцы ў Мілены Сідарэні (да 10 гадоў) і Арцёма Сіняўскага (да 12), дзясятыя — у Арцёма Стрыбука (да 12) і Максіма Царука (да 14).

* * *

На Мемарыяле І. Варакомскай у польскіх Сувалках (88 удзельнікаў) Аляксей Аляксандраў, Аляксей Фёдараў, Юрый Ціханаў і Кірыл Ступак занялі адпаведна 2-е, 7-е, 10-е і 13-е месцы. Антон Сягоднік быў трэці ў Пецярбургу, Сяргей Каспараў — пяты з 79 у бельгійскім Шарлеруа, Мікіта Маёраў — дзявяты са 185 у шведскім Лундзе і чацвёрты з 48 у Італіі, а Сяргей Азараў — дванаццаты з 72 у Вашынгтоне. На фестывалі ў Рызе ў турніры «А» Мікіта Маёраў быў пятнаццаты з 88, а ў турніры «С» (45 удзельнікаў) Арцём Сіняўскі і Уладзіслаў Каташук заваявалі першы і трэці прызы. Аляксей Чэрапаў падзяліў 1-2 месцы на Мемарыяле А. Рубінштэйна ў польскім горадзе Паляніца-Здруй.

На турніры па хуткіх шахматах у Пецярбургу (300 удзельнікаў) Аляксей Фёдараў фінішаваў трэці, Кірыл Ступак — сямнаццаты, Аляксей Аляксандраў — трыццаты. У амерыканскім Грынсбара Сяргей Азараў быў дзясяты з 88, а Андрэй Гаравец заняў трэцяе месца на яшчэ адным турніры ў ЗША (55 удзельнікаў).

У Гродне на турніры па хуткіх шахматах (42 гульцы) прызавую тройку склалі Арцемій Гогалеў (Расія), Ягор Філіпец і Уладзімір Верамейчык, па «класіцы» (28 удзельнікаў) — Арцемій Гогалеў, Валянцін Ежаль і Руслан Яраш (Расія), па бліцы (56) — Андрэй Альховік, Ягор Філіпец і Арцемій Гогалеў.

Прызёрамі чэмпіянату Беларусі сярод інвалідаў сталі Ігар Расіхін, Дзмітрый Вярбіцкі і Яўген Койшман.

* * *

І ў вялікім, і ў малым сельсавеце на першы план выходзіць работа з людзьмі, проста цяпер яе маштабы значна большыя, падсумавала кіраўнік мясцовай улады.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Пружанскі раён.

Краявіды Ружан.

ПАСЛЯ АБ'ЯДНАННЯ

Вяскоўцы задаволены, гараджане не пакрыўджаны

У Полацкім раёне пяць гадоў таму ў адну адміністрацыйную адзінку аб'ядналі гарадскую і раённую тэрыторыі. Як адбілася аптымізацыя на жыцці гараджан і вясковых жыхароў?

Спачатку не ўсе разумелі

Канешне, статус горада пасля аптымізацыі змяніўся, але неабходнасць у ёй была выклікана жыццёвымі рэаліямі. Чым вяскоўцы горшыя ў пытаннях магчымасці атрымліваць, напрыклад, медыцынскія і іншыя паслугі? Пра тое, што трэба падцягнуць узровень жыцця ў вёсках да гарадскога, не раз гаварыў і кіраўнік дзяржавы. Не сакрэт, што напачатку хапае незадаволеных аптымізацыяй гараджан.

На думку **старшыні Полацкага раённага Савета дэпутатаў Іосіфа ГРЫБОВІЧА**, аб'яднанне пайшло рэгіёну на карысць.

— Спачатку былі, канешне, такія, хто не разумеў, навошта аб'ядноўваць «горад з раёнам». Але ў пераважнай большасці людзі не адчулі нічога дрэннага. Нараканняў няма. Горад дапамагае сялу і наадварот. У выніку аптымізацыі сельсаветаў іх стала на тры менш. Гэта звязана ў ліку іншага і з тым, што колькасць насельніцтва зменшылася, — кажа ён.

Як заўважыў **намеснік старшыні райвыканкама па сацыяльных пытаннях Пётр ПЯТКЕВІЧ**, раён не быў першым у краіне, дзе правялі аб'яднанне. Першапраходцам стала Мінская вобласць. Практычна паралельна праводзілася падрыхтоўчая работа да аб'яднання органаў улады на Аршаншчыне.

— Гэта ўзбуйненне дало магчымасць скараціць апараты кіравання. Новы штатны расклад быў аптымізаваны. Засталіся працаваць найлепшыя спецыялісты, прафесіяналы з гарвыканкама і райвыканкама, — успамінае ён.

Чэргаў няма

Наконт трывогі гараджан напярэдадні аптымізацыі. Напрыклад, людзі турбаваліся, што з'явяцца чэргі па талоны да ўрачоў і іншыя нязручнасці.

Галоўны ўрач Полацкай цэнтральнай раённай бальніцы Аляксандр Гудкоў нагадаў, што аб'яднанне гарадской і раённай структур адбылося задоўга да аналагічнага на ўзроўні ўлады.

— І гэта станоўча паўплывала на даступнасць медыцынскай дапамогі для насельніцтва. У першую чаргу — для вяскоўцаў, якім стала прасцей атрымаць кансультацыі так званых вузкіх спецыялістаў. Лягчэй стала вырашаць пытанні паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы, у прыватнасці, набыцця абсталявання, — адзначыў суразмоўнік.

Дарэчы, усе ФАПы па-ранейшаму працуюць.

Што датычыцца адукацыі, дык і тут нічога кардынальнага не адбылося. **Начальнік упраўлення па адукацыі райвыканкама Ірына ДРАЗДОВА** кажа, што аб'яднаны станоўчы вопыт горада і раёна пайшоў усім на карысць.

— Інтэграванне дазволіла больш эканомна выкарыстоўваць рэсурсы, стварыць больш спрыяльныя ўмовы для арганізацыі вучэбнага працэсу, — паведаміла яна.

Начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Святлана КАСЬЯНАВА расказала пра ўнікальнасць рэгіёна:

— У нас па два аддзяленні дзённага знаходжання грамадзян сталага ўзросту і людзей з абмежаванымі магчымасцямі — у горадзе і гарадскім пасёлку Ветрына. Добра наладжана работа выязных сацыяльных пунктаў, якія дапамагаюць вырашаць розныя жыццёвыя праблемы па месцы жыхарства — толькі за мінулы год зарэгістравана больш за 1000 зваротаў. Шмат робіцца для комплекснага надомнага абслугоўвання — пры падтрымцы мясцовай улады ва ўсіх больш чым 400 вёсках вядзецца такая работа.

Паветраны шар... над сельсаветам

Пагутарыў і са **старшынёй Палатоўскага сельскага Савета дэпутатаў Інгай КАЗЛОВАЙ.** У склад яго ўвайшоў Юравіцкі сельсавет. Колькасць вяскоўцаў, пра жыццезабеспячэнне якіх яна як кіраўнік мясцовай улады клапоціцца, павялічылася прыкладна з 800 да 1380. А вёсак — з 12 да 30.

— Скаргаў ад насельніцтва няма. Напрыклад, тут добрае транспартнае забеспячэнне. І гэта прытым, што тэрыторыя вельмі расцягнутая. У Захарнічах па-ранейшаму працуе дзіцячы садок. У Палаце аказваецца медыцынскае абслугоўванне. У прыватнасці, ёсць бальніца сястрынскага догляду з паліклінікай, — кажа старшыня сельскага Савета.

Аб'яднанне дазволіла актывізаваць і турыстычную дзейнасць у раёне. Тут функцыянуе больш за трыццаць аграсядзіб, распрацавана каля дваццаці турыстычных маршрутаў. Прасцей стала арганізаваць комплексны адпачынак: спачатку паказаць старажытны горад, а потым прапанаваць перамясціцца бліжэй да прыроды...

Адной з новых цікавінак стала магчымасць адправіцца ў падарожжа на паветраным шары. Баравухскі сельсавет атрымаў «паветранае судна» ў рамках аднаго з праектаў ЕС па падтрымцы развіцця тэрыторый. Экскурсіі арганізуюць, калі ёсць калектыўныя заяўкі. Агляд горада і наваколляў з вышыні птушынага палёту — гэта насамрэч нешта неардынарнае. Такое мала дзе прапануюць.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

АПТЫМІЗАЦЫЯ

СКАМАРОШКІ, ФАБРЫЧНЫ І БЕЛЫЯ РОСЫ

Як развіваюцца тэрыторыі, якія «праглынуў» горад

Роўна 10 гадоў таму плошча Гродна павялічылася больш чым у два разы. У склад горада ўвайшлі тры дзясяткі прыгарадных вёсак і садовых таварыстваў. Далучыліся да горада і ворныя землі... Наш карэспандэнт прайшлася па адным з былых пасёлкаў, каб убачыць змены, якія адбыліся за гэты час.

У красавіку 2008 года выйшаў указ Прэзідэнта, згодна з якім былі зменены межы горада Гродна. Тэрыторыя абласнога цэнтра значна пашырылася. Калі да гэтага часу яго плошча складала каля шасці тысяч га, то пасля ўказа павялічылася да 14 тысяч. У склад горада ўвайшлі 25 вёсак трох сельсаветаў, а таксама больш за 10 дачных таварыстваў.

Начальнік упраўлення землеўпарадкавання гарвыканкама Андрэй КУХЦЮК удакладняе: у 2011 годзе выйшаў яшчэ адзін указ аб пашырэнні межаў горада. Але гэта быў не такі маштабны перадзел — да горада далучылі каля 200 га зямлі з вёскай Альшанкай, побач з якой цяпер вырас новы мікрараён з такой жа назвай.

На новых тэрыторыях паўсюдна ідзе забудова, кажа Андрэй Кухцюк. З дапамогай спутнікавай карты робім спробу ацаніць маштабы таго, што зроблена за 10 гадоў. Вяртаемся ў 2008-ы. Здымкі паказваюць, што некаторых мікрараёнаў не было ўвогуле, у іншых — участкі асвойваліся, можна сказаць, кропкава. Напрыклад, каля былой вёскі Зарыца налічваецца ўжо пяць мікрараёнаў. А ў той час тут толькі пачалі будавацца.

Андрэй Кухцюк раз-пораз паказвае гарадскія «кавалкі», дзе яшчэ нядаўна было пуста. Разам з жылымі дамамі выраслі вытворчыя прадпрыемствы, гандлёвыя і сацыяльныя аб'екты. Пракладзены не проста дарогі, а сапраўдныя магістралі. У выніку будаўніцтва знікла і вёска Дзевятоўка на ўскрайку горада, дзе ішлі здымкі фільма «Белыя Росы». Па сутнасці, яна паўтарыла лёс вёскі папулярнай кінакарціны. Ад «кіношнай» гродзенскай вёскі застаўся толькі калодзеж. Нядаўна тут устанавілі драўляныя постаці галоўных герояў стужкі — Фядоса, Цімафея і яго сабакі Валета. У гонар фільма і былых вёсак адна з вуліц новага мікрараёна носіць назву «Белыя Росы».

Андрэй КУХЦЮК.

Дарэчы, назвы іншых вёсак таксама перайшлі ў вуліцы. Так у горадзе з'явіліся вуліцы Паўднёвая, Солы, Падкрыжацкая, Грандзіцкая, Кульбакі, Новікі і іншыя. Былым вёскам давялося пацясніцца, каб упусціць у сваё асяроддзе горад. Гэты працэс зрушыў з месца развіццё тэрыторый — тут пачалі актыўна фарміраваць участкі пад індывідуальнае будаўніцтва. Напрыклад, у былой вёсцы Вішнявец іх створана каля 80. Праўда, і кошт зашкальвае: за 10 сотак — 18 тысяч долараў у эквіваленце. Таму многія аддаюць первагу кватэрам, тут актыўна вядзецца забудова жылога мікрараёна. Горад усё больш масава засяляе ўскрайкі.

> І хоць дамы даўно знаходзяцца на балансе гарадской ЖКГ, іх абслугоўванне пакідае жадаць лепшага. Па словах жанчын, нярэдка ў падвалах стаіць вада, двор не асвятляецца.

У гарадскім асяроддзі апынуўся і пасёлак Фабрычны з плошчай амаль 232 га. Гэта самая вялікая вясковая тэрыторыя, якая ўвайшла ў склад горада. У свой час пасёлак быў пабудаваны для работнікаў мясцовай птушкафабрыкі. Адсюль нярэдка паступалі скаргі на стан дарог, цеплазабеспячэнне, транспарт. Шмат праблем усплыло падчас пераходу пасёлка на баланс горада — асабліва па стане інжынерных камунікацый.

Што змянілася ў Фабрычным за «гарадскі» перыяд жыцця?

Можна сказаць, што горад узяў былы пасёлак у шчыльнае кола. З аднаго боку яго «падпірае» прамысловая зона, з другога — новы жылы мікрараён. Побач вырас яшчэ адзін — катэджны. Цяпер гэты працэс актывізаваўся. Па словах аднаго з забудоўшчыкаў, тут узводзіцца каля 20 жылых аб'ектаў. «Раней цяжка было атрымаць участак, — кажа Ігар. — Але потым адмовіліся ад стадыёна і аддалі яго тэрыторыю пад жыллё. Амаль усе ўчасткі добра разышліся. Попыт быў вялікі, хоць і кошт — таксама».

Ігар пералічвае плюсы свайго выбару: дзіцячы садок, Цэнтр культуры, гандлёвае забеспячэнне, добрыя дарогі, камунікацыі. Праўда, узнікла праблема з падключэннем электраэнергіі — жыхары другі месяц чакаюць узгаднення праекта ад энергетыкаў.

А вось жыхарка Раіса Міхайлаўна выказала прэтэнзію да транспартнікаў: маўляў, як толькі зрабілі добрую дарогу, праз пасёлак перастаў хадзіць аўтобус № 12, некалькі прыпынкаў зараслі травой. А пажылым людзям цяпер трэба ісці аж у канец вуліцы.

Знайшлося што сказаць і тром жанчынам-пенсіянеркам з завулка Маладзёжнага. Усе яны жывуць у кватэрах, якія ў свой час атрымалі ад птушкафабрыкі. І хоць дамы даўно знаходзяцца на балансе гарадской ЖКГ, іх абслугоўванне пакідае жадаць лепшага. Па словах жанчын, нярэдка ў падвалах стаіць вада, двор не асвятляецца. Гэтыя праблемы ўзнімаліся перад гарадскімі ўладамі і дэпутатамі падчас сустрэчы ў маі гэтага года. Ёсць надзея на іх вырашэнне.

Сёння Фабрычны цяжка назваць вёскай. Паўгода таму пракладзена дарога, прыведзены ў парадак дамы і сядзібы. Хутчэй, гэта месца нагадвае еўрапейскі прыгарад з зялёнай зонай і спакойным укладам жыцця.

Вядома, стан новых гарадскіх тэрыторый не ўсюды мае такі выгляд. Напрыклад, жыхарка мікрараёна, дзе была вёска Забаляць, паскардзілася на дрэнную цэнтральную дарогу. Дарэчы, такі факт не адзінкавы. Развіццё інфраструктуры не паспявае за асваеннем участкаў. Між тым значная плошча свабодных тэрыторый распрацавана менавіта пад індывідуальнае будаўніцтва. Такіх участкаў на сёння ў гарадскім рэестры каля 250. З іх больш за 200 адведзена для тых, хто стаіць у чарзе, астатнія прададуць з аўкцыёну.

Толькі за мінулы год горад рэалізаваў праз чаргу 200 участкаў. Сёлета ўжо 150. Кожны аўкцыён праходзіць з продажам трох-чатырох участкаў. На думку Андрэя Кухцюка, цяпер галоўная задача — забеспячэнне камунікацыямі і інфраструктурай тых мікрараёнаў, якія вядуць актыўную забудову. Работы ў гэтым кірунку хопіць на найбліжэйшыя 10—15 гадоў.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Фабрычны ў гарадскім атачэнні.

ОАО «Дорстройиндустрия» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества

Лот № 1	**Оборудование II технологической линии щебеночного завода, г. Фаниполь**	Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 37	Начальная цена с НДС, бел. руб.	Задаток с НДС, бел. руб.	Шаг аукциона, %
			153 646,22	15 364,62	5
10 единиц оборудования: агрегат мелкого дробления ДРО-702-10 (инв. № 4250), агрегат мелкого дробления ДРО-702-10 (инв. № 4251), агрегат сортировки ДРО – 690 (инв. № 4255), агрегат сортировки ДРО – 669 (инв. № 4261), конвейер специальный СМД-151-80 (инв. № 4267), конвейер специальный СМД-151-60 (инв. № 4272), конвейер специальный СМД-151-60 (инв. № 4273), конвейер специальный СМД-151-60 (инв. № 4275), конвейер специальный СМД-151-50 (инв. № 4285), агрегат грануляции ДРО-630 (инв. № 4259)					
Лот № 2	**Агрегат грануляции ДРО-630 (инв. № 4260)**	Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 37	73 794,00	7379,40	5

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот №1, 2 по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи в течение 5 (пяти) календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота № 1, 2: в течение 10 банковских дней с момента заключения договора купли-продажи.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

Аукцион состоится 01.10.2018 в 11.00 по адресу: г. Фаниполь, ул. Заводская, д. 1-1, 3-й этаж, актовый зал

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона (Продавцом)); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (Объектами) (по форме, установленной Организатором аукциона (Продавцом)) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ. лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – документ, подтверждающий полномочия. Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках не подлежат разглашению.
Задаток перечисляется на счет BY32BAPB30123268800100000000 в ЦБУ № 510 г. Минск, Региональная дирекция по Минской области ОАО «Белагропромбанк», БИК BAPBBY2X, УНП 100211220, ОКПО 03455184. Получатель – ОАО «Дорстройиндустрия». Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Дорстройиндустрия» (Лоты № 1, 2), проводимом 1 октября 2018 года.
Задаток, уплаченный участником, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта (Объектов). Задаток, уплаченный участниками, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа участника от участия в аукционе.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.00 до 12.00, с 13.00 до 17.00 по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 1-1, каб. 202. Окончание приема заявлений – 28.09.2018 в 17.00. Заключительная регистрация участников – 01.10.2018 с 08.30 до 11.00 по месту проведения аукциона.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом (Объектами). Контактное лицо для осмотра Объекта: Браим Дмитрий Александрович, тел. 8 (029) 774 07 33.
Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Организатор (Продавец): ОАО «Дорстройиндустрия», г. Фаниполь, ул. Заводская, 1-1, тел.: (01716) 7-31-06, (029) 774-07-33 • www.dsi.by • e-mail: jurist@dsi.by

НА СЛЫХУ

ДАЕШ МАБІЛЬНАСЦЬ!

Не памылюся, калі скажу, што шмат абурэнняў насельніцтва выклікаюць праблемы з рухам на дарозе, а вострае пытанне затораў у мегаполісе наогул здаецца невырашальным... Тым не менш выйсце ёсць, трэба толькі пайсці насустрач новым экалагічным тэхналогіям і пераняць пэўны вопыт у заходніх краін.

РУХАЮСЯ — ЗНАЧЫЦЬ, ІСНУЮ

З 16 па 22 верасня ў Беларусі пройдзе Еўрапейскі тыдзень мабільнасці (ЕТМ). Гарады Беларусі чацвёрты раз далучацца да гэтай агульнаеўрапейскай ініцыятывы.

З кожным годам яна набірае папулярнасць. 2018-ы стаў рэкордным па агульнай колькасці ўдзельнікаў — 2470 гарадоў і населеных пунктаў з 50 краін свету. Удзел нашай краіны ў кампаніі таксама ўражвае: усяго за тры гады колькасць гарадоў Беларусі, якія афіцыйна далучыліся да тыдня, вырасла з трох да сарака васьмі. Напярэдадні ў сталіцы прайшла сустрэча прадстаўнікоў адміністрацый гарадоў Беларусі, якія падтрымалі ініцыятыву (Мінск, Брэст, Полацк, Наваполацк, Пінск і інш.).

> 30-хвілінная паездка на ровары пакрывае штодзённую патрэбу арганізма ў фізічнай актыўнасці, перашкаджаючы развіццю атлусцення і іншых захворванняў.

Мэта кампаніі — паўсюдна спрыяць мабільнасці гарадскога насельніцтва, а для гэтага трэба развіваць грамадскі транспарт і ствараць камфортныя і бяспечныя ўмовы для пешаходаў і веласіпедыстаў. (Недарэмна тыдзень завяршаецца акцыяй «Сусветны дзень без аўтамабіля».)

— Гарады і населеныя пункты, якія рэгулярна ўдзельнічаюць у тыдні мабільнасці, становяцца больш прыкметнымі і на міжнародным узроўні, — лічыць **старшыня Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў Сяргей МАСЛЯК.** — Яны дэманструюць арыентацыю на дасягненне Мэт устойлівага развіцця, дзве з якіх найбольш цесна звязаныя з транспартам і мабільнасцю. Згодна з мэтай устойлівага развіцця № 3, сусветная супольнасць плануе ўдвая скараціць колькасць смерцяў і траўмаў ад дарожна-транспартных здарэнняў, а таксама значна павысіць на ўсіх відах транспарту асабістую бяспеку пасажыраў. Акрамя таго, устойлівыя транспартныя сістэмы гарантуюць харчовую бяспеку (мэта № 2), якасць аховы здароўя (мэта № 3), даступнасць школ (мэта № 4).

Сяргей Масляк таксама адзначыў, што ЕТМ — гэта не разавая, а доўгатэрміновая акцыя, якая будзе спрыяць паляпшэнню развіцця інфраструктуры і якасці жыцця:

— У Мінску 85 % выкідаў, што забруджваюць паветра, належыць транспартным сродкам і толькі 15 % — вытворчасці, таму асаблівую ўвагу неабходна ўдзяляць менавіта транспартнаму кірунку.

А **Андрэй ПІЛІПЧУК, намеснік начальніка ўпраўлення рэгулявання ўздзеяння на атмасфернае паветра і водныя рэсурсы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя,** дадае, што беларускія мерапрыемствы на ЕТМ адпавядаюць і 11-й мэце ўстойлівага развіцця:

— Забеспячэнне адкрытасці, жыццястойкасці і экалагічнай устойлівасці гарадоў і населеных пунктаў — мэта № 11 — накіравана на тое, каб да 2030 года гарантаваць доступ насельніцтва да бяспечных і ўстойлівых транспартных сістэм, палепшыць работу грамадскага транспарту, яго прыстасаванасць для людзей з інваліднасцю.

З КОЛАМІ І БЕЗ БАЛЬНІЧНЫХ

Сёння з улікам развіцця гарадской мабільнасці велізарнае значэнне набывае распаўсюджванне роварнага руху. **Анастасія ЯНЧЭЎСКАЯ, дырэктар Мінскага роварнага таварыства,** прывяла статыстыку супольнасці, якая кажа сама за сябе:

— За мінулы 2017 год 1,2 % людзей здзяйснялі працоўныя перамяшчэнні на ровары. У нашай краіне каля 800 000 ровараў, з іх 40 % — дарослых.

Праект «Гарадскі веларух у Беларусі» пастаянна развіваецца і прымае ўсё больш актыўных людзей.

Дарэчы, прыхільнасць да гэтага віду транспарту ўплывае і на якасць жыцця: 30-хвілінная паездка на ровары пакрывае штодзённую патрэбу арганізма ў фізічнай актыўнасці, перашкаджаючы развіццю атлусцення і іншых захворванняў. Людзі, якія рэгулярна ездзяць на ровары, радзей бяруць бальнічны.

— А інвестыцыі ў развіццё велаінфраструктуры, — працягвае Анастасія Янчэўская, — сёння самыя апраўданыя дзякуючы мноству фактараў: росту кліентуры мясцовых крам (па звестках шэрагу замежных даследаванняў, веласіпедысты часцей становяцца пакупнікамі рознічнага гандлю і кліентамі сферы паслуг, прадпрыемстваў грамадскага харчавання), зніжэнню выдаткаў на ахову здароўя, скарачэнню колькасці заторaў і выхлапаў.

Акрамя таго, ровар з'яўляецца самым хуткім відам транспарту пры паездках на адлегласць да 5 км, апярэджваючы па гэтым паказчыку як аўтамабіль, так і грамадскі транспарт. Акрамя таго, ровар яшчэ і самы эканамічны.

ДАСТУПНАСЦЬ І КАМФОРТ

Што ж такое мабільнасць у шырокім сэнсе? Мабільнасць (рухомасць) — гэта здольнасць чалавека перасоўвацца самастойна або з дапамогай транспартных сродкаў. Яна вызначаецца адлегласцю, якую пераадольвае чалавек (група людзей) за адзін дзень (іншы каляндарны перыяд) у працоўных мэтах або для атрымання базавых паслуг. Паводле ацэнак еўрапейскіх экспертаў, умовы мабільнасці на адну траціну вызначаюць якасць жыцця. **Валянціна ЛЯВОНЧЫК, намеснік старшыні праўлення РГА «Беларускі саюз транспартнікаў»,** адзначае, што ўстойлівая гарадская мабільнасць — гэта камфортнасць усіх відаў перамяшчэнняў, наладжаны доступ усіх грамадзян да неабходнага месца.

Сёння транспартнікі арыентуюцца на рэкамендацыі ААН, еўрапейскую транспартную палітыку і паспяховы вопыт гарадоў у галіне кіравання мабільнасцю:

— Мы імкнёмся да стварэння транспартнай сістэмы, якая гарантуе высокую якасць паслуг, бяспеку, а таксама абарону навакольнага асяроддзя. Да таго ж укладанні ў транспарт сёння адны з самых выгадных, паколькі адзін рубель, укладзены ў грамадскі транспарт, дае чатыры рублі ў спадарожных сферах. Гэта значыць — мае ярка выражаны пазагаліновы эфект.

У цэлым спецыялісты розных сфер ацэньваюць правядзенне Еўрапейскага тыдня мабільнасці вельмі станоўча — у першую чаргу як платформу для мэтанакіраванага інфармавання пра шкоду залішняга выкарыстання легкавых аўтамабіляў, іх негатыўны ўплыў на здароўе людзей і навакольнае асяроддзе.

Розныя гарады і іншыя населеныя пункты Беларусі многае ўжо робяць у кірунку ўстойлівай мабільнасці, але маюць патрэбу ў сістэматычнай інфармацыйнай падтрымцы. Сёння яны маюць розную ступень гатоўнасці да ўдзелу ў міжнародных праектах і праграмах. Тым не менш мясцовыя гарадскія ўлады прыходзяць да разумення, што ўстойлівая мабільнасць — гэта не толькі транспартнае пытанне, а арганізацыя ўзаемадзеяння розных зацікаўленых бакоў.

Вольга ПРАЛЮК.
Фота аўтара.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	Червенское районное потребительское общество, г. Червень, ул. Ленинская, 32

Предмет аукциона
Местоположение – Минская обл., Червенский р-н, г. Червень

Наименование	Общ. площадь	Инв. номер	Адрес (улица, № дома)
Лот № 1			
Здание майонезного цеха	203 кв. м	615/С-16211	ул. К.Маркса, д. 21
Составные части: пристройка, сарай			
Сведения о земельном участке: пл. **0,0724** га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания майонезного цеха			
Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 96 288,85 бел. руб.			
Лот № 2			
Магазин № 2	427,9 кв. м	615/С-16290	ул. К. Маркса, д. 9
Составные части: пристройка, два сарая пристройки, топочная			
Сведения о земельном участке: пл. **0,1793** га предоставлен на праве аренды по 29.01.2028 для обслуживания здания магазина № 2. Ограничения (обременения) прав – охранные зоны сетей и сооружений водоснабжения, пл. 0,0406 га			
Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 106 633,33 бел. руб. (снижена на 20 %)			
Лот № 3			
Магазин № 18	105,8 кв. м	615/С-16085	ул. Калинина
Составные части: склад, котельная, сарай, туалет			
Сведения о земельном участке: пл. **0,0264** га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания и эксплуатации объектов торговли			
Начальная цена по лоту № 3 с НДС 20 % – 14 144,57 бел. руб.			
Лот № 4			
Магазин № 3	115,9 кв. м	615/С-16316	пер. Партизанский
Составные части: пристройка холодная			
Сведения о земельном участке: пл. **0,0364** га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания и эксплуатации объектов торговли			
Начальная цена по лоту № 4 с НДС 20 % – 15 617,39 бел. руб.			

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**10** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущие извещения о проведении аукциона опубликованы в газете «Звязда»: по лоту № 1 – 10.07.2018; по лоту № 2 – от 18.08.2018

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона: 24.10.2018 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 22.10.2018 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29

Предмет аукциона

Лот № 1. Нежилое помещение № 3 (помещение, не относящееся к жилищному фонду), общ. пл. **64,9 кв. м,** инв. номер **400/D-101856, Гродненская обл., г. Гродно, ул. Соломовой, д.137, пом. 3.**
Начальная цена с НДС 20 % – 86 034,00 бел. руб.

Лот № 2. Встроенное помещение (магазин) (торговое помещение), общ. пл. **175,5 кв. м,** инв. номер **630/D-38885, Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Притыцкого, 4.**
Начальная цена с НДС 20 % – 208 478,40 бел. руб.

Обременения. Лот № 1 обременен договором аренды

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок заключения договора купли-продажи: 15 рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона: победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **30** календарных дней с момента заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.

Передача имущества победителю аукциона, заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 5 рабочих дней с момента внесения оплаты в размере 100 % стоимости недвижимого имущества.

Победителю аукциона (единственному участнику аукциона), обратиться за государственной регистрацией перехода права собственности на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке. Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также регистрацией возникновения (перехода) соответствующего права на земельный участок несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона по Лоту № 1	**31.10.2018** в 14.30 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов по Лоту № 1	**29.10.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время проведения аукциона по Лоту № 2	**22.10.2018** в 14.30 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов по Лоту № 2	**18.10.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by**

КАРЦІНКІ З ГЛЫБІНКІ

ПЛЮС НА МІНУС

У Ляхавіцкім райвыканкаме падвялі вынікі паўгоддзя. Карэспандэнт «Ляхавіцкага весніка» разбіраўся, дзе страцілі, а дзе знайшлі.

Намеснік старшыні райвыканкама Андрэй Навагран прааналізаваў найбольш важныя сацыяльна-эканамічныя паказчыкі. Ён адзначыў, што за першае паўгоддзе ў раёне тэмп росту экспарту тавараў без уліку рэспубліканскіх прадпрыемстваў вырас больш чым на трэць. Тым часам прамыя замежныя інвестыцыі склалі два мільёны долараў пры заданні 830 тысяч долараў. Таксама выканана на 19 % больш запланаванага будаўніча-мантажных работ.

Разам з тым, канстатаваў Андрэй Навагран, па васьмі даведзеных паказчыках раён пакуль мінусуе. Нязначнае зніжэнне маецца ў стварэнні новых працоўных месцаў, у тэмпе росту рознічнага тавараабароту, у энергазберажэнні. А тэмп росту экспарту паслуг (асноўныя экспарцёры — прадпрыемствы прыватнай формы ўласнасці) склаў 29,6 % пры заданні 103,8 %. У чатыры разы знізіўся экспарт транспартных паслуг, у тры — турыстычных, будаўнічыя і зусім не прадстаўлены. Дапушчаны мінусы па ўзроўні заработнай платы, вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі, уводзе жылля, рэнтабельнасці продажаў, атрыманні чыстага прыбытку.

ПЫТАННЕ З ДУШКОМ

У суботу ў Светлагорску прайшоў флэшмоб супраць паху, які даносіцца з новага завода беленай цэлюлозы. Каля 200 дарослых і дзяцей выйшлі на Цэнтральную плошчу ў медыцынскіх масках і з паветранымі шарамі зялёнага колеру. На самім Светлагорскім ЦКК за дзень да гэтага арганізавалі сустрэчу з прадстаўнікамі грамадскасці і СМІ, куды прыйшоў і карэспандэнт «Светлагорскіх навін».



Наведвальнікі прайшлі ўвесь цыкл вытворчага працэсу, уключаючы ачышчальныя збудаванні. На ўсіх этапах кіраўнік прадпрыемства Юрый Крук і спецыялісты ў структурных падраздзяленнях адказвалі на пытанні. Пасля адбылася нарада, дзе таксама прасвятлілі некаторыя моманты. У прыватнасці, прадстаўнікі вытворчасці пацвердзілі яе бяспеку, але пагадзіліся, што пах існуе, таму будуць прымацца меры, каб яго паменшыць.

НЕ ТОЛЬКІ СПАРТЫЎНЫ ІНТАРЭС

Побач з вёскай Мазуршчына Салігорскага раёна прайшоў Рэспубліканскі турыстычны злёт, прысвечаны 60-гадоваму юбілею Салігорска. 14 камандаў з усёй краіны спаборнічалі ў тэхніцы воднага, веласіпеднага і пешаходнага турызму, за імі сачыў карэспандэнт газеты «Шахцёр».

Злёт накіраваны на тое, каб падрыхтаваць удзельнікаў да спартыўных турыстычных паходаў, павысіць іх тэхнічнае і тактычнае майстэрства. Урачыстае адкрыццё спаборніцтваў наведаў і старшыня Салігорскага райвыканкама Алег Паскробка. «Турызм — гэта асаблівы від спорту, дзе спалучаюцца трываласць, сіла волі і таварыская ўзаемадапамога, — лічыць ён. — Гэтыя якасці патрэбныя і ў працы. Таму гартаванне характару і праява найлепшых яго ўласцівасцяў на спаборніцтвах дазволіць і на вытворчасці паказваць годны вынік». Спартсменам прыйшлося перабірацца па навясной пераправе з веласіпедам, пераадольваць крутыя спускі і пад'ёмы, пралятаць «маятнікам» над умоўнай перашкодай і многае іншае.

Падрыхтавала Надзея АНІСОВІЧ.

ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ

ЯК У СВАІМ ДОМЕ

Лёзненскі раён становіцца адным з самых дагледжаных у Прыдзвінні

НАВЕСЦІ ідэальны парадак усюды — важна не толькі таму, што сёлета — Год малой радзімы. Восенню будзе святкавацца 75 гадоў з даты вызвалення раёна ад фашысцкіх захопнікаў. Лёзненшчына, дарэчы, стала першай з вызваленых на тэрыторыі Віцебшчыны. І адной з першых ва ўсёй рэспубліцы. Таму справа гонару зрабіць так, каб любы населены пункт, двор ці ферма былі ў ідэальным парадку.

Падчас пасяджэння і свята аграрнага гарадка.

Больш бы нераўнадушных...

На сумесным пасяджэнні прэзідыума райсавета дэпутатаў і райвыканкама адбылася канструктыўная і шчырая размова на гэты конт, не без крытыкі.

Старшыня райсавета дэпутатаў Тамара ДРЫЛЁНАК расказала пра стан спраў па навядзенні парадку на зямлі і пра неабыякавых людзей, якія на ўласным прыкладзе паказваюць, як можна зрабіць прыгажосць на сваім падворку. Цікава, што сярод іх ёсць бабуля, якой за 90.

А яшчэ адна зямлячка — сама добрая гаспадыня. Таму хоча, каб і вакол было прыгожа. Тэлефануе на прамую лінію ў райвыканкам, каб паўплывалі на суседзяў, якія не спяшаюцца навесці парадак каля дома. Ёсць і кіраўнікі, якія актыўна, не для справаздачы, бяруць удзел у добраўпарадкаванні. **Старшыня сельгаспадаркі «Чкалаўскі» Дзмітрый ГРЫГАРОВІЧ** арганізуе ўкос траў у населеных пунктах. І скошанае — на корм для скаціны тым, хто трымае прыватныя падсобныя гаспадаркі.

Начальнік РАНС Віталь ЧАЙКІН разам з падначаленымі добраўпарадкоўвае тэрыторыі не толькі падчас суботнікаў. Як дэпутат райсавета агітуе людзей самім ствараць нешта для дзяцей і ўнукаў на тэрыторыі каля ўстаноў адукацыі, у цэнтральным скверы. І ўжо многае зроблена. Маёр унутранай службы адзначыў, што народныя выбраннікі ў ліку іншага не шкадуюць асабістых грошай. Аб'яўляюць збор сродкаў, каб выкарыстаць на добраўпарадкаванне.

> Шэфы, якія адказваюць за вёскі, не толькі павінны часцей там бываць, але зрабіць нешта канкрэтнае і карыснае.

У Год малой радзімы юрыдычным асобам, землякам прапануюць, пры іх жаданні, зрабіць імянныя падарункі для Лёзна. А для аграгарадкоў — спрыяць у набыцці або вырабе гульнёвых дзіцячых пляцовак.

Улада, зрабі!?

На мерапрыемстве, дарэчы, было агучана, што трэба больш актыўна прыцягваць землякоў, прадпрыемствы, арганізацыі, прадпрымальнікаў да навядзення парадку.

І неабходна, па-добраму, мяняць менталітэт людзей. Многія, на жаль, жывуць па прынцыпе: «Улада мне павінна!» Трэба прывучаць людзей самім нешта рабіць, як кажуць беларусы, талакой.

Напрыклад, у заходніх раёнах вобласці традыцыйна значны ўклад у навядзенні парадку на могілках — ад сваякоў тых, хто там пахаваны. Клапоцяцца яны, каб спілавалі старыя дрэвы, зрэзалі кустоўе, адрамантавалі агароджы вакол усёй тэрыторыі. Такую практыку трэба ўкараняць. І ў цэлым, што датычыцца навядзення парадку, неабходна выкарыстоўваць новыя больш плённыя падыходы. А для гэтага трэба актыўна агітаваць людзей, каб яны па-іншаму ставіліся да добраўпарадкавання.

Тамара Дрылёнак расказала, што ў пытанні добраўпарадкавання тых жа могілак неабходна актывізаваць дзейнасць старэйшын. І вялікі патэнцыял у дзейнасці старэйшых па вуліцах, дамах, пад'ездах. А шэфы, якія адказваюць за вёскі, не толькі павінны часцей там бываць, але зрабіць нешта канкрэтнае і карыснае.

Таксама Тамара Дрылёнак акцэнтавала ўвагу на тым, каб быў парадак на ўсіх аб'ектах, якія знаходзяцца на балансе сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Такую ж думку выказаў і **старшыня райвыканкама Іван ЛАЎРЫНОВІЧ**. Парадак павінен быць, як у сваім доме. Трэба зрабіць прыватны выгляд на кожным машынным двары ці ферме. І не толькі з фасаднай часткі, а на ўсіх тэрыторыях.

Было вельмі карысна пачуць і тое, што хвалюе моладзь. Падлетак ад імя равеснікаў, такіх жа актывістаў мясцовага маладзёжнага парламента, звярнуў увагу прысутных, што неабходна, напрыклад, валейбольная пляцоўка каля вадаёма, дадатковае добраўпарадкаванне і развіццё парку райцэнтра. Хлопцы і дзяўчаты гатовыя браць удзел у работах і нават збіраць грошы. Такую шчырую ініцыятыву падтрымалі прысутныя ў зале. І, дарэчы, адразу пасля пасяджэння скрынку для добраахвотных ахвяраванняў разам напоўнілі больш за 400 рублёў!

На кантролі

У раёне сёлета правялі тры суботнікі. Заробленыя больш за 4,5 тысячы рублёў выдаткавалі на добраўпарадкаванне. Арганізавалі агляды-конкурсы на найлепшыя аб'екты. На больш чым 9,2 гектара правялі работы па знішчэнні баршчэўніку.

А раённай інспекцыяй прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя даследаваны каля 140 тэрыторый розных аб'ектаў. «Узялі на кантроль» каля 280 парушэнняў, сума штрафаў перавысіла 4,1 тысячы рублёў.

Вялікі «пласт» і па выніках наглядна дзейнасці ўстановы дзяржаўнага санітарнага нагляду раёна. У прыватнасці, супрацоўнікі ведамства пабывалі ў 105 населеных пунктах. І ў прыкладна чвэрці выявілі парушэнні. Большасць — 43,6 % — наконт утрымання кантэйнерных пляцовак. Правялі 54 маніторынгі ўтрымання палос адводу аўтамабільных і чыгуначных шляхоў. І падчас 21 таксама выявілі парушэнні.

Старшыня райвыканкама патрабаваў канкрэтыкі ў тым, што будзе зроблена: хто і што павінны зрабіць, і ў якія тэрміны.

Лёзненшчына — радзіма сваякоў Марка Шагала. Раён мяжуе з Віцебскім раёнам — «уязнымі варотамі» абласнога цэнтра, праз яго тэрыторыю пралягае траса ў Смаленскую вобласць. Мясцовая ўлада ставіць задачу зрабіць край адным з самых дагледжаных у Прыдзвінні. І для гэтага часта не трэба вялікіх грошай, а галоўнае — жаданне і актыўны ўдзел кожнага жыхара.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Мясцовае самакіраванне

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 20 верасня 2018 года.